

Ежы Паўяновіч ☞ 3


# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ


АНАТОЛЬ ДУНДА ☞ 4




http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 48 (2533) Год XLIX Беласток, 28 лістапада 2004 г. Цана 2,00 зл.


*А. Латышонак: Сабралася нас пад дваццаць чалавек — прафесійных гісторыкаў, журналістаў ды аматараў гісторыі. Можна смела заявіць, што без вялікай арганізацыйнай базы даем навуковую вытворчасць парытэтную любому інстытуту...*

# Поспех надзвычайны

**18 і 19 лістапада прайшла ў Беластоку канферэнцыя „Нацыянальныя праблемы на Беларусі ў XIX стагоддзі”, ладжаная Беларускім гістарычным таварыствам і Кафедрай беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку. Пры нагодзе мерапрыемства пра працу БГТ папрасіў я расказаць ягонага старшыню д-ра Алега ЛАТЫШОНКА.**

***— У час канферэнцыі можна было пра беларусаў пачуць, што яны па характару вялыя, што — як часам у народзе гаворыцца — ні за сабою, ні перад сабою. Як гэтая характарыстыка прыстае да Беларускага гістарычнага таварыства?***

— Наша Таварыства працуе з 1993 года. Мы спадзяваліся заснавання тут абяцанага нам Беларускага інстытута; дзеля працы ў ім і я з’ехаў у 1991 годзе ў Беласток. Калі стала відавочным, што тыя абяцанні не збіраюцца збывацца, мы вырашылі дзейнічаць самі і стварыць Беларускае гістарычнае таварыства; гэтая выдатная задума апраўдалася. Сабралася нас пад дваццаць чалавек — прафесійных гісторыкаў з універсітэтаў і школ, журналістаў ды аматараў гісторыі, гуртуючы такім чынам вельмі моцнае асяроддзе. Можна смела заявіць, што без вялікай арганізацыйнай базы даем навуковую вытворчасць парытэтную любому інстытуту. Гэта з’яўляецца найлепшым сведчаннем выконванай намі вялікай працы, сведчаннем нашых здольнасцей і энергіі.

***— З якімі цэнтрамі супрацоўнічае Таварыства?***

— Нашы галоўныя навуковыя партнёры ў Беларусі. Перш за ўсё гэта Гродзенскі універсітэт імя Янкі Купалы. Гэта Інстытут гісторыі Беларускай акадэміі навук, Беларускі дзяржаўны універсітэт і Педагагічны універсітэт імя Максіма Танка ў Мінску. Крыху меншыя нашы кантакты з Берасцем; з іншымі беларускімі цэнтрамі — спарадычныя. З польскіх устаноў найшчыльней супрацоўнічаем з беластоцкім аддзяленнем Польскага гістарычнага таварыства, крыху з Універсітэтам імя Мікалая Каперніка ў Торуні. На ладжаных намі мерапрыемствах бываюць вучоныя з усёй Польшчы ды з Літвы. Круг аўтараў, што пішуць у нашы „Беларускія гістарычныя сшыткі”, ахопліває ўсе кантыненты, а найбольш экзатычнага падпісчыка маем у Японіі.

***— З якімі цяжкасцямі прыходзіцца змагацца Таварыству?***



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Яўген Мірановіч, Сяргей Габрусевіч (Гродна) і Алег Латышонак*

— З навуковага пункту гледжання цяжкасцей няма, паколькі мы забяспечаны грантамі з Міністэрства культуры РП і з Управы горада Беластока. Крыху горш выглядае справа папулярызацыі гістарычных ведаў у народзе, бо Таварыства з’яўляецца абмежаваным кругам людзей маючых дачыненне да гістарычнай навукі.

Не ўдаецца нам, нягледзячы на неаслабныя захады, атрымаць грошы на масавыя мерапрыемствы. Самы вялікі мой боль ад таго, што ніхто не хацеў падтрымаць рыцарскі турнір „Перад Грунвальдам”, які меў быць доказам супольнасцей традыцый, калі беларускае рыцарства — так як у 1410 годзе — ладзіла б свае зборы ў Бельску-Падляшскім. Рыцары з Беларусі, якія ўдзельнічаюць у інсцэніроўцы бітвы пад Грунвальдам, ахвотна прынялі б удзел у такім мерапрыемстве.

Час-часом удаецца нам ладзіць канферэнцыі або выстаўкі, якія выклікаюць большае зацікаўленне грамадства, калі яны кранаюць культуру, напрыклад, з Музеем у Бельску пра бежанства, пра Тарасевіча, Драздовіча.

***— Часта працамі гісторыкаў паслугоўваюцца ідэолагі. Мабыць, аднак, Беларускае гістарычнае таварыства выхаду на ідэалогію не мае?***

— Так, мы не ствараем грунту для ніякай ідэалогіі, але працуем ідэйна! Відаць ужо контуры асобнай — беластоцкай — школы гістарыяграфіі Беларусі. Маем польскую гістарычную адукацыю, ведаем беларускую і польскую культуры — і гэта наша спецыфіка. Але пішам з беларускага пункту гледжання.

***— Канферэнцыя была прысвечана станаўленню беларускай нацыі ў 19-м стагоддзі. Цяпер маем 21-шы век. Ці не паверне ён ходу нацыянальнае жыцця ў адваротным напрамку: ці пасля колішняга ўздыму цяпер не пойдзе спад?***

— Канферэнцыя была прысвечана многім нацыям, хаця яе асноўная плынь засяроджвалася вакол развіцця беларускай нацыянальнай ідэі. А згортвання беларускай нацыі не будзе, не! У 20-м стагоддзі было выканана такое заданне, пра якое ў 19-м ніхто не думаў. У пачатку мінулага стагоддзя была абвешчана, а ў канцы — узнікла незалежная Беларусь; гэта поспех надзвычайны! Многія нацыі даўжэй намагаліся адваяваць сваю дзяржаўнасць — і не ўдалося, а беларусы за сто гадоў яе стварылі! Мы разважаем, што так доўга замінала выявіць беларускую нацыянальную ідэю, бо гэта ў нейкай ступені было ненатуральнае. І прыходзім да згоднай высновы, што прычыніліся да гэтага навізна назвы дзяржавы і канфесійныя падзелы ў народзе.

* * *

Лёс нашай нацыі варылі розныя вядучыя польскія і расійскія палітычныя кухары. Канферэнцыя паказала таксама, што спецыі для нашай кухні рыхтавалі і зусім ананімныя ды несвядомыя нават нашага існавання еўрапейскія абывацелі. І хаця з беларусаў выйшлі Каяловіч з аднадумнікамі, усё ж такі не толькі гімнам стойкія Польшча з Украінай не прапалі...

І як тут быць песімістам?

**Аляксандр Вярбіцкі**

## Чарговы эксперымент ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Сёмага лістапада на экранах беларускіх тэлевізараў, як знак урачыстасці гэтай даты з’явілася чырвона-зялёная кветка. Беларускія ўлады святкавалі дзень кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Праўда, не яны адны. Расія таксама. Толькі ў Расіі гэты дзень назвалі чамусьці днём прымірэння. Ці то з дурноты, ці гэта адкрыты здзек з памяці ахвяраў камуністычнага рэжыму...*

## Белыя плямы ☞ 2

Ежы Плютовіч

*Наша сучаснасць — перамога цывілізацыі карцінак, фільма, тэлебачання, відэа-касет і DVD, камп’ютэрных гульняў. Хопіць, што час ад часу перагляну новыя творы калег па пяру, каб не страціць арыентацыю ў літаратурным кружочку, — пачаў свае разважанні паэт-постмадэрніст, а ты глыбока з ім не пагаджаешся, ды, усё-такі, маўчыш...*

## Гродна — Беласток ☞ 5

Міхась Хмялеўскі

*Усе нашы мастацкія калектывы прадэманстравалі ў Гродне тое, што на Беласточчыне жыве беларускае слова, песня і музыка, што жыве беларускасць сярод старэйшага і маладога пакалення. Польскія хоры задавальнялі душэўныя нацыянальныя запатрабаванні на родную песню, музыку і танец прыбылых на канцэрт мясцовых палякаў...*

## Выкладчык і літаратар ☞ 9

Анна Садоўская

*Плакід Янкоўскі вельмі кахаў свой край, родны куток, усіх землякоў, хатні звычай. Радзіма і не прыгажосць былі для яго найвялікшай раскошай. Як расліна без сонечных праменняў, як рыба без вады, ён не мог жыць далёка ад свайго краю, ад роднай хаты...*

## Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

*Прымаючы іншае грамадзянства, легіянеры губляюць сувязі з радзімай, тым больш, што беларускае заканадаўства не дазваляе мець падвойнае грамадзянства. На Беларусь рэдка хто вяртаецца. Такія прыклады рэдкія — нядаўна пасля сямі гадоў легіянерства ў Нямеччыне, Швейцарыі і Аўстрыі вярнуўся Міхаіл Усачоў...*

## Да юбілею ліцэя ☞ 11

Васіль Сакоўскі

*А вось многія з тых, якія ў школе не грашылі ні працавітасцю, ні дысцыплінай і на якіх школа не надта разлічвала, радзяць сабе ў дарослым жыцці зусім добра і вельмі добра. Становяцца яны знанымі і шанаванымі людзьмі...*

# Чарговы эксперымент



Ідэалогію кожнай краіны можна беспамылкова вызначыць па тых святах, якія яна прызнае і святкуе. Для большасці дзяржаў свету галоўным нерэлігійным святам ёсць Дзень Незалежнасці. На глебе гэтага свята пачынаюць фармавацца галоўныя каштоўнасці грамадзяніна краіны: адказнасць за сваю Радзіму і свой народ, павага да герояў, што палеглі за незалежнасць, клопат пра будучыню гэтай дзяржавы. Маладая беларуская дзяржава, вызваліўшыся на пачатку дзевяностых гадоў ад камуністычнага ўладарання Савецкага Саюза, таксама пайшла гэтым шляхам. У дадатак яна прадэманстравала ўсяму свету хрысціянска-еўрапейскі накірунак свайго развіцця, абвясціўшы забароненыя бальшавікамі галоўныя хрысціянскія святы дзяржаўнымі. І каталіцкія, і праваслаўныя. Гэта чарговы раз падкрэслівала міралюбівасць і талерантнасць развіцця Беларусі, захаванне тых традыцый, якія былі ў нас здаўна. Але ў 1994 годзе да ўлады прыйшлі сілы, якіх гэтыя каштоўнасці не вабілі. Як вынік у календарах Беларусі з'явіліся іншыя святы. А некаторыя з тых, што былі, у тым ліку рэлігійныя, страцілі магчымасць быць выхадным днём.

Сёмага лістапада на экранах беларускіх тэлевізараў, як знак ўрачыстасці гэтай даты з'явілася чырвона-зялёная кветка. Беларускія ўлады святкавалі дзень кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Праўда, не яны адны. Расія таксама. Толькі ў Расіі гэты дзень назвалі чамусьці днём прымірэння. Ці то з дурноты, ці гэта адкрыты здзек з памяці ахвяраў камуністычнага рэжыму. Чым кіраваліся расійскія ідэолагі сказаць цяжка, бо такое масавае знішчэнне людзей, якое было пасля перамогі той рэвалюцыі, замірэнчым працэсам не назавеш. І калі цяперашняя Расія хацела б адмежавацца ад той злачыннай палітыкі, якую праводзілі бальшавікі, то гэты дзень быў бы абвешчаны як дзень жалобы па ахвярах камуністычнага рэжыму. Ды відаць не хацелі адмежавацца. Хіба толькі хацелі зрабіць выгляд. Надурыць такім чынам свет.

А вось расійскія сілы ў Беларусі прыдурвацца не сталі. І як толькі ўлада апынулася ў іх руках, сталі дзейнічаць па-камуністычнаму. Рашуча і нахабна. Змена сімволікі, наданне рускай мове ў Беларусі статуса дзяржаўнай, інтэграцыйныя працэсы з Расіяй, вяртанне камуністычных свят... Усё гэта сведчыла пра аднаўленне бальшавіцкай ідэалогіі. Як і пры Савецкім Саюзе. Толькі з адным адрозненнем. І гэтае адрозненне прыводзіць у жах. Калі камуністы некалі хавалі свае злачынствы, або надавалі ім афарбоўку нейкай там барацьбы (ці то класавай, ці то за светлую будучыню ўсяго чалавецтва), то цяпер жудасныя злачынствы бальшавіцкага рэжыму і яго антычалавечы характар былі выкрыты і асветлены ў друку. Адважыцца вярнуцца да камуністычна-бальшавіцкіх ідэалаў азначала адкрыта паказаць сваю сутнасць свету.

Хто мог бы пайсці на гэты крок сам. Наўрад ці хто адважыўся б. Нават кіраўнік камуністаў Расіі Зюганаў стараецца рабіць выгляд, што ён ужо не такі камуніст як былі, а нашмат лепшы. На гэты крок мог пайсці толькі марыянетачны рэжым, які выконвае чужую волю тых, хто жадае застацца ў гэтым працэсе незаўважаным. Да пары да часу, пакуль гэтая ідэалогія зноў не стане на ногі. Узамен гэты рэжым атрымае якую захоча падтрымку.

Над беларусамі зноў ставіцца чарговы эксперымент. Менавіта тут зараз выпрабоўваюцца тэхналогіі вяртання масавай думкі ў старое рэчышча, тэхналогіі вяртання грамадства да камуністычных ідэалаў, тэхналогіі пераходу ад маладой дэмакратыі да цэнтралізаванай улады. І не трэба быць надта разумным, каб здагадацца, што сцэнарыі пішуцца ў Крамлі, каб пасля гэтых эксперымент паставіць над іншымі: над украінцамі, над рускімі, каб адрадзіць імперыю. І не так важна як яна будзе называцца, КДБэшна-ФСБэшная імперыя, ці проста Расійская імперыя, ці АССCР (Аднолены Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік) ці Еўраазіяцкі Звяз. Галоўнае, каб яна была магутнай, і з адзіным, шматнацыянальна-безнацыянальным народам-зомбі.

Каму гэта трэба? Беларусам? — Не. Рускім? — Не. Рускі народ сам закладнік гэтай палітыкі. Стан рускага народа можна сёння ахарактарызаваць так: інтарэсы рускага народа і Расійскай дзяржавы прама супрацьлеглыя. Бо жыць у міры і добрасуседстве з іншымі — гэта натуральнае жаданне кожнага народа, а ваяваць у Чачні і ставіць эксперыменты над беларусамі — у „інтарэсах" Расійскай імперыі. Адказ на пытанне, каму патрэбныя такія эксперыменты трэба шукаць у вечным змаганні дабра і зла. А хто на чыім баку, вызначыць проста. Нават па той прыкмеце, якое дзяржаўнае свята даспадобы існай уладзе. Ці дзень кастрычніцкай рэвалюцыі, ці Дзень Незалежнасці.

**Віктар Сазонаў**

# Белыя плямы пры канцы свету



О, душа горада пры канцы каляндарнага года, о, страла часу, пранікаючая збунтаванае сэрца, о, выпешчанае мроямі месца пад сонцам, о, цяню лянівага даабедняга часу... У паўзмроку кавярні адчуваецца, як вібрыруе ціша, якую парушае адно лёгенькае брынчанне думак прысеўшых за столікам пісьменнікаў і мастакоў. І ты адчуваеш, як ахоплівае цябе імгла асенняй хандры і ты тады найбольш ахвотна памаўчаў бы, самотны, у крузе сяброў.

— Я зразумеў, што павінен жыць згодна з плынню гістарычнага працэсу. А гэта азначае, што я кінуў чытаць кнігі. Амаль увесь свой кнігазбор вынес у падвал, пакінуў на паліцы ледзь пару слоўнікаў. Наша сучаснасць — перамога цывілізацыі карцінак, фільма, тэлебачання, відэа-касет і DVD, камп'ютэрных гульняў. Хопіць, што час ад часу перагляну новыя творы калег па пяру, каб не страціць арыентацыю ў літаратурным кружочку, — пачаў свае разважанні паэт-постмадэрніст, а ты глыбока з ім не пагаджаешся, ды, усё-такі, маўчыш.

— Незалежна ад таго, што і я сам ствараю фундаменты цывілізацыі карцінак, — перапыніў яго мастак з доўгай па пояс барадой, — аднак у кнігарні побач усё бачу чытачоў капаючыхся па паліцах з кнігамі.

— Чытач для мяне не існуе, а нават абмяжоўвае маю свабоду. Я ствараю з унутранай патрэбы. Хопіць, што схаваюся сярод жменькі сяброў, адчуваючых падобна так як і я. Хопіць, што сустрэнуся з сябрамі на літаратурнай імпрэзе, падыхаю атмасферай літаратурнага клуба. Па-за рубяжом літаратурнага свету адчуваю ж, што акаляе мяне непрыязны тлум, якому чужыя мае пачуцці і адчуванне, — сцепануў плячыма паэт. А ты задумваешся, адкуль у модным мастаку столькі антыпатыі да гэтых малых людзей, што экзістуюць падалёк ад вялікагарадскога гоману.

— Ува мне ўзнікае ўражанне, што не хапае ў цябе паслядоўнасці, — сказаў універсітэцкі прафесар-пенсіянер. — З аднаго боку — дух часу, якому стараешся паддацца, а з другога — боязь рэакцый чэрні, якая ж таксама — твор таго духу.

— Дык як жа мне паспець за тым, што немінучае?

— А ці мы мусім паспяваць? Тое паспяванне небяспечнае, бо асуджаем сябе на перайманне, паўторнасць.

— Даруйце, калі ласка, — уключыўся журналіст мясцовай газеты, — што рэагуем занадта эмацыйна на праблемы, тыповыя для другагарадных народаў, маргінальных, якіх лёсы малазначныя ў культурных сталіцах зямнога шара, такіх, як Парыж, Лондан ці Нью-Йорк.

— Нашы літаратуры, з Сярэдняй Еўропы, нічога не ўнеслі ў здабыткі сусветнай культуры, гэта маладыя, няспелыя літаратуры, — у воку паэта затрапятала сляза.

— Прапаную, значыць, пачаць ствараць, запоўніць прабелы, белыя плямы ў межах нашай культуры. Выказваю тэзіс парадаксальна аптымістычны, калі перад намі, стваральнікамі, так многа ёсць што зрабіць, — падагуліў прафесар.

Мы застылі з паадкрыванымі ратамі.

**Ежы Плютовіч**



Фота Аляксандра Вярбіцкага

**Вачыма еўрапейца**

# Пад парасонам



— Наша замежная палітыка адзначаецца грэхам адмаўлення ў адносінах да Беларусі і Украіны ў сэнсе гатоўнасці такое, якое б яны жадалі, — так пераконваў тэлеглядачоў у апошняй праграме „Спецыяльная лінія" Ян Новак-Езяранскі, легендарны дырэктар польскай секцыі Радыё „Вольная Еўропа". Ягоныя думкі прагучалі месяц пасля парламенцкіх выбараў і рэферэндуму ў Беларусі і амаль два тыдні пасля першага тура прэзідэнцкіх выбараў на Украіне ды знойку пераможных для Джорджа В. Буша ў ЗША. Ян Новак-Езяранскі бадай як першы паляк уголас паказаў дарогу, якая перакладваецца на практычныя дзеянні ў адносінах да ўсходніх суседзяў, у чыіх дзяржавах, далікатна кажучы, не шануюцца дэмакратычныя нормы абавязваючыя ў заходніх краінах. Даў ясна зразумець, што Польшча адна не ў змозе што-небудзь зрабіць.

— Мусім шукаць саюзнікаў перш за ўсё ў НАТА, — сказаў. А далей:

— Мы не васал ЗША, а саюзнік, і можам уплываць на амерыканскую палітыку.

І, фактычна, здаецца, Польшча можа працягнуць дапаможную далонь у бок Беларусі ці Украіны пры ўмове, што пакажа, што з яе моцны партнёр (з моцнай падтрымкай), не толькі эканамічна. Дарэчы, пакуль што нават у эканамічным сэнсе было б гэта немагчыма. Можа, аднак, паказаць, што яна важны элемент Паўночнаатлантычнага саюза, які раўнаважыць расійскую цягу да экспансіі на ўсходнюю мяжу Польшчы, саюза, які дае пачуццё бяспекі пад сваім парасонам. Тое ж, калі справа ў Беларусі і Украіне, адносіцца да рэляцый Варшавы ў адносінах да самога Вашынгтона. Амерыканскае перакананне, што Польшча, поруч з Вялікабрытаніяй, найбольш лаяльны партнёр Штатаў, дае прывілею значнага ўплыву на фармаванне гэтай імперыяй паводзін у адносінах да гэтых краін. Польшча пры гэтай сіле павінна як найхутчэй выйсці з канкрэтным планам дапамогі ў пабудове дэмакратыі і правой чалавека ў першую чаргу ў Беларусі. На Украіне, незалежна ад скрыгітаў, дэмакратычныя механізмы прыведзены ў рух. У Беларусі яны тармазяць і ржавеюць. Ініцыятыва апрацавання інструкцыі паслугоўвацца крок за крокам прыладамі дапамагаючымі ў тым, каб прывесці дэмакратыю ў рух — заданне для польскай дыпламатыі, вядома, не без удзелу тых, хто мае ёю карыстацца (а нават абавязкова з імі) і з польскімі асяроддзямі сёння апазіцыйнымі ды з польскай меншасцю, якая заўважае такую патрэбу.

Пакуль што, месяц пасля беларускіх выбараў, якія-небудзь дэкларацыі дапамогі Беларусі досыць няскладныя, гучаць з боку розных асяроддзяў (напрыклад, аднаўленне Радыё „Рацыя"), а няраз маюць партыйна-папулісцкі характар. Цяжка не пагадзіцца з палітыкам Уні вольнасці, віцэ-старшынёй Еўрапарламента Янушам Анышкевічам, які пісаў на пачатку лістапада ў „Выбарчай газеце": „Сёння мы сведкі вялікай дэзінтэграцыі пагляду вакол польскай замежнай палітыкі. Апазіцыя не магла, на жаль, не даць спакусіцца, каб уключыць гэтыя пытанні ў абшар, на якім можна змагацца з кіручай каліцыяй, а таксама супернічаць у здабыванні падтрымкі электарату".

Неабходна, значыць, перад тым, як узяцца за ўпарадкаваныя крокі, запрасіць да апрацоўкі тае інструкцыі абслугоўвання прылад для наладжання дэмакратыі ў Беларусі — як гэта называе Януш Анышкевіч — зінтэграванне палітычнага класа. Прытым неабходна паралельна пакарыстацца парасонам мацнейшых. Віцэ-старшыня ЕС кажа: „Калі нам залежыць на поспяховасці дзеяннеяў, а не на серы слоўных дэкларацый, прыемных на слых, неабходная будзе падтрымка шмат якіх уплывовых атлантычных дзяржаў". І дадае яшчэ: „Варта падаць ЗША ўжо сёння прапанову супрацоўніцтва ў рэалізацыі ўстаноўленай Кангрэсам праграмы дзеянняў у адносінах да Беларусі". Тут варта, аднак, прыняць да ведама заўвагу Яна Новака-Езяранскага:

— У адносінах да Украіны і Беларусі абавязвае цярплівасць.

**Мацей Халадоўскі**

# Свой ва ўстанове

Падляшскага віцэ-ваяводу Ежы Паўяновіча рэгіянальная прэса прыгадвае нячаста. Ужо неўзабаве, значыць, пасля парламенцкіх выбараў, пэўна, навесну, адыдзе ён з пасады разам з урадам, прадстаўніком якога з'яўляецца разам з ваяводам Маркам Сташлінскім. Што яму ўдалося? Якія ў яго погляды, сярод іх — на праблемы беларускага асяроддзя, з якога выводзіцца?

Абсяг ягоных абавязкаў абшырны. Назірае ён за аддзеламі: рэгіянальнага развою, дзяржаўнага скарбу і пераўтварэнняў уласнасці, грамадзянскіх спраў і міграцыі, грамадскай палітыкі і Бюро распараджэння структурнымі фондамі. Назірае таксама над Куратарыяй асветы і ваяводскімі інспектаратамі: будаўнічага нагляду, гандлёвай інспекцыі, фармацэўтычным і над захавальнікам помнікаў. Старшынюе Ваяводскаму камітэту змагання і пакутніцтва ды з'яўляецца шэфам Ваяводскага калектыву крызіснага рэагавання.

— Справа ў тым, каб грамадзяне, якія карыстаюцца ўстановай, мелі да яе лёгкі доступ і хутка маглі аформіць у ёй свае справы, — запэўнівае.

## *Я ганаруся...*

— У час выканання сваіх абавязкаў удалося мне давесці да канца справу пабудовы помніка фурманам. Гэта на пачатку паўнамоцтваў была адна з першых спраў, з якімі я сутыкнуўся. Лічу, што ў сувязі з гэтым ніхто не пакрыўджаны. Трэба было завяршыць пытанне пахавання гэтых бедных, сціплых людзей, якія адпакутавалі не па сваёй віне.

Меў ён таксама, як наглядаючы за захавальнікам помнікаў, немалы ўдзел у аднаўленні манастырскага ансамбля ў Супраслі. Падкрэслівае, што шмат працы ўклаў у падрыхтоўку самаўрадаў да ўспрыняцця структурных еўрасаюзных сродкаў:

— Падляшскія самаўрады мелі нагоду навучыцца еўрасаюзных працэдур наконт іх здабывання. Таму Падляшскае ваяводства было адным з першых бенефіцыентаў праграмы PHARE 2000-2003. Цяпер падпісваем дамовы на дзеянні ў 2004-2006 гадах. Для Падляшша ў рамках гэтай інтэграванай аператыўнай праграмы гэта агулам 110 млн. еўра. Тры гады абучэнняў і практыкаванняў не пайшлі ўпустую. Сёння мы ў змозе прыняць гэтыя сродкі. Варта прыгадаць, што перадуваходныя сродкі, прыкладам — PHARE, былі выкарыстоўваны ў 95-99 працэнтах. Усё тое перакладзецца на развой нашых гмін, асабліва тых бяднейшых, дзе трэба завяршыць правядзенне водаправодаў, пабудову ачышчальняў сцёкаў ці каналізацыю. Датычыць гэта асабліва такіх паветаў, як Гайнаўскі, Бельскі ці Сямятыцкі.

Віцэ-ваявода Паўяновіч ганарыцца таксама працэсам пераўтварэнняў уласнасці ў рэгіёне. Пералічвае, што на працягу апошніх трох гадоў удалося з поспехам, пад ягоным наглядам, прыватызаваць 123 прадпрыемствы з паём Дзяржаўнага скарбу. Спасылаецца на прадпрыемства „Намех" у Гайнаўцы:

— Паявіліся тут новыя месцы працы. Пачынаецца экспарт.



**ЕЖЫ ПАЎЯНОВІЧ нар. у 1952 г. у Фальварках-Тыльвіцкіх. Кончыў Геадэзічна-картаграфічны тэхнікум у Беластоку, а ў 1976 г. Беластоцкую політэхніку з дыпломам інжынера сухапутнага будаўніцтва. Наступныя 7 гадоў працаваў у Беластоцкім будаўнічым камбінаце. У 1983 г. перайшоў на працу ў Жыллёвы кааператыў „Сонечны Сток", дзе працаваў намеснікам старшыні. Раней грамадска засядаў у яго ўправе як член. Ад 1994 г. быў намеснікам рэгіянальнага дырэктара Рэгіянальнага аддзела ПКО БП. У 1988-1990 гг. быў старшынёй Гарадской народнай рады, а ў 1994-2001 гг. быў радным у Радзе горада Беластока. З 1998 г. да 2001 г. (да моманту назначэння на пасаду віцэ-ваяводы) быў старшынёй клуба Беластоцкая самаўрадавая кааліцыя Лявіца і Незалежныя „Разам". Член СЛД.**

## *Адмовіцца ад заяў*

— Я не з'яўляюся прыхільнікам чыста эканамічнага падыходу да справы ліквідацыі школ. Дарога дзіцяці ў школу павінна быць як найкарацэйшая. І хоць нярaз эканоміка бярэ верх, то не любой цаной рэалізавалі мы заявы самаўрадаў аб ліквідацыі школьных адзінак, — кажа.

Мяркуе, што дасягненнем з'яўляецца рэалізацыя праграмы забеспячэння школ у гімбусы, атрыманыя з Міністэрства адукацыі.

— Ёсць, аднак, такія гміны, што не атрымалі яшчэ ні аднаго такога школьнага аўтобуса, — заўважае.

У наступным годзе самаўрадам спатрэбіцца больш за сто гімбусаў. Летась здабылі іх 17, сёлета — 8, раней — 16.

— На фоне краіны наша ваяводства ў гэтых адносінах прэміявалася. Пулька была павялічана таксама таму, што ў нашым ваяводстве пражываюць нацыянальныя меншасці з уласным школьніцтвам.

Перад школамі з беларускай (і літоўскай) мовай стала яшчэ іншая праблема. Найвышэйшая кантрольная палата (NIK) наказала, спасылаючыся на агульнае правіла распараджэння Міністэрства адукацыі, падаваць пісьмовыя заявы, якія будуць пацвярджаць волю навучання ў гэтых школах.

— Я не ўпэўнены, ці інтэрпрэтацыя таго распараджэння — належная. Ёсць адпаведныя запісы ў статутах гэтых школ. Свядомасць бацькі і вучня, якога пасылаюць у гэтую школу — ужо дакларацыя. Усе ад многіх гадоў апіраюцца на такую ідэалогію. З фармальнага боку можна гэтак зрабіць. Варта, аднак, задумацца, ці не адмяніць тое распараджэнне. А калі яно ўжо мусіць прымяняцца, меншасць павінна мець свядомасць, ці гэта не робіцца, каб кагосьці ўніжыць. Я перакананы, што не было такога намеру. Я б схіляўся да таго, каб адмовіцца ад такіх заяў. Я не чуў аб такіх выпадках, каб дзіцё, якое вучыцца ў меншаснай школе, не хацела вывучаць гэтую мову. Калі б так было, можна ж пайсці ў іншую школу.

## *Цяга без падтэкстаў*

Справа заяў у школах з беларускай мовай наклалася на цэлы шэраг здарэнняў, якія ўспрымаюцца з апаскай прадстаўнікамі беларускай меншасці: накіраванне г.зв. справы „Нівы" Найвышэйшай кантрольнай палатай у пракуратуру, адхіленне дэпутатамі ў законе аб меншасцях істотных запісаў аб двухмоўнасці назваў і павышэнне да 50% парога ліку насельніцтва з меншасці гміны пры магчымасці карыстання мовай меншасці ва ўстановах.

— Я заўжды далёкі ад пошукаў кантэкстаў, — кажа віцэ-ваявода Паўяновіч. — Нават справы далікатныя, вельмі цяжкія ці адмоўныя стараюся ўспрымаць у катэгорыях пазітыўнага мыслення. Гэта фактычна адбываецца ў адзін час, падказваючы інтэрпрэтацыю, што гэта мэтанакіраванае дзеянне. Каб так сцвердзіць з перакананнем, трэба мець вельмі сур'ёзныя аргументы. Я ўпэўнены, што іх няма і не магу сцвярджаць, што гэта так і адбываецца.

Прытым дадае:

— Калі такога тыпу здарэнні, аднак, адбываюцца ў больш-менш у адзін час, трэба людзям патлумачыць, што гэта, мабыць, чыстая выпадковасць. Калі справа ў хібах (парушэннях) у „Ніве"... Ёсць пытанне наконт меркавання таго, хто накіраваў заяву ў пракуратуру, ці гэта сур'ёзныя парушэнні, каб падвяргаліся аж такому парадку. Маю надзею, што справа вырашыцца не так, каб за невялікую правіну было вынесена большае пакаранне. Нельга, аднак, на выбраных глядзець праз пальцы; закон аб публічных фінансах датычыць усіх суб'ектаў. З таго, што я ведаю, вынікае, што Міністэрства культуры не палічыла гэтую справу як вялікую правіну.

Спасылаючыся на закон аб меншасцях, Ежы Паўяновіч верыць, што будзе ён выпраўлены ў Сенаце, што абяцаў яму шэф дамінуючага ў гэтай палаце СЛД Кшыштаф Янік:

— Генеральна добра, што той закон ёсць. Дзякуючы яму мы, як дзяржава, паказваем, што вартыя мы членства ў ЕС і раўняем да еўрапейскіх стандартаў. Паказваем, што паважаем меншасці, што мы — талерантныя.

Аргументы некаторых палітыкаў з правага боку палітычнай сцэны, якія выказваюцца за адхіленнем двух асноўных запісаў (гаворка аб г.зв. нямецкай справе) віцэ-ваявода каменціруе:

— Гэта заслугоўвае на негатыўны погляд. Быццам стварэецца штосьці праеўрапейскае, элегантнае, а пачынаюцца пошукі падтэкстаў: не маем нічога супраць беларусаў, але баімся немцаў. Я не разумею такога погляду. Зноў аказваецца, што палітыкаў варта правяраць не па гожых словах, дэкларацыях. А калі нават і так, то варта аб іх падумаць ля выбарчых урнаў. Мы павінны захоўваць больш працяглую памяць.

## *Паказваць добрыя дзеянні*

Пасля апошніх парламенцкіх выбараў і рэферэндуму ў Беларусі прэм'ер Марэк Бэлька заявіў працяг абмежавання афіцыйных зносін з Беларуссю. ЕС і ЗША не выключаюць рэстрыкцый. Як у такой сітуацыі мае наладжваць зносіны ўрадавая адміністрацыя на Падляшшы?

— Ваяводскую адміністрацыю цікавяць далейшыя кантакты з нашымі беларускімі суседзямі, Гродзенскай і Брэсцкай абласцямі, — заяўляе віцэ-ваявода Паўяновіч. — Тое ж датычыць і Калінінградскай вобласці. Думаем асабліва пра гаспадарчыя, гандлёвыя кантакты. Не павінна нічога змяніцца. Нельга зачыняцца, будаваць барыкады. Будзем карыстацца супольнымі трохбаковымі праграмамі. На мяжы з Беларуссю трэба больш адкрыцца на грамадскія кантакты.

Можа, рэактывуючы Радыё „Рацыя"?

— Калі б яно мела служыць толькі прапагандзе, магло б гэта кепска ўспрымацца, — адказвае віцэ-ваявода.

Прадбачвае ён у наступным годзе адкрыццё пешаходнага пагранперахода ў Белавежы і завяршэнне рэканструкцыі і адкрыццё турысцкага воднага перахода на Аўгустаўскім канале, які мае быць занесены ў сусветны спісак культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Маюць быць адкрыты пагранпераходы ў Ліпшчанах і Хварасцянах, у Ялоўцы і Катэрцы. Полаўцы стануць міжнародным пагранпераходам, не толькі польска-беларускім, з магчымасцю перасякання мяжы грузавымі машынамі, не цяжэйшымі за 7,5 тон.

— Мяжу трэба ўшчыльніць ад кантрабанды, зла, а не ад добрых адносін з суседам. Нельга нам на гэта абражацца і дыктаваць яму ўмовы. Мы — суверэнныя дзяржавы. Без кантактаў будзе гэта немагчымае. Нельга нам паказваць партнёру, што хочам яго толькі павучаць. Хочам паказваць добрыя прыклады шляхам добрых дзеянняў. Такое добрае дзеянне — адкрыццё на свет.

**Мацей Халадоўскі**

## Патрэбныя святлафоры

У Бельску-Падляшскім буйнее дарожны рух і становіцца неабходнай змена яго арганізацыі. Дагэтуль святлафоры ўстаноўлены толькі на двух скрыжаваннях вуліцы Міцкевіча.

Камісія асветы, культуры і публічнага парадку Рады павета прапануе ўключыць у план мясцовага развіцця інфраструктуры Бельскага павета на 2004-2006 гг. задачы ўстаноўкі святлафораў на тых скрыжаваннях вуліц, дзе найчасцей здараюцца калізіі.

Паводле Управы павета, у Бельску трэба ўстанавіць святлафоры на скрыжаваннях вуліцы Міцкевіча з вуліцамі 11 Лістапада і Панятоўскага (прадбачваны кошт каля 150 тысяч злотаў). Акрамя гэтага трэба падумаць пра такое ж новаўвядзенне на скрыжаванні вуліцы Міцкевіча з Казімежоўскай, аднак з папярэдняга назірання ўстаноўлена, што дзеля направы плаўнасці руху трэба ў гэтым месцы перабудаваць геаметрыю ўсёй камунікацыйнай сістэмы. Апрацаванне канцэпцыі і тэхнічнай дакументацыі гэтай задачы (коштам каля 20 тысяч злотаў) магло б завяршыцца да канца 2006 года, а рэалізацыю задачы можна было б прыняць на 2007 год (кошт — залежна ад памераў інвестыцыі — 150-250 тысяч злотаў). У рэалізацыю гэтых задач павінна ўключыцца самаўправа горада Бельска, бо прапанаваная змена арганізацыі руху паўплывае на ўсю камунікацыйную інфраструктуру горада. Прапанаваныя кошты мерапрыемства самаўрады падзялілі б паміж сабою пароўну.

**Міхал Мінцэвіч**

## „Энергетычны" аўтобус

Апошнім часам Сямятычы наведаў спецыяльны аўтобус з перасоўнай выставай энергаэканомных сістэмаў і абсталяванняў, якія можна прымяняць у жылых дамах.

Візіт аўтобуса — частка акцыі папулярызацыі аднаўляльных крыніц энергіі — сонца, вады, ветру і біямасы. Персанал аўтобуса — эксперты Краёвага агенцтва шанавання энергіі — раяць як зменшыць выдаткі на электраэнергію, ваду і апал, прымяняючы адпаведную тэрмаізаляцыю будынкаў, энергаэканомныя электраляпмпачкі і краны для аэразацыі вады ці сонечныя батарэі для награвання вады.

Наведвальнікі аўтобуса мелі магчымасць атрымаць адказ на свае пытанні, пабачыць на спецыяльных прыборах колькасць зэканомленай энергіі ці вады, а таксама атрымаць даведачныя матэрыялы.

У нашым рэгіёне аўтобус мае наведаць, між іншым, Беласток, Саколку, Гайнаўку, Чорную-Беластоцкую і Супрасль. На маю думку, добра было б, каб аўтобус даехаў яшчэ ў гмінныя мясцовасці і буйныя вёскі, паколькі выстава паказвае важныя справы, якія датычаць кожнага з нас. **М. Ц.**

# Развіваць прадукцыю



*Анатоль Дунда хацеў бы ў гаспадарчых будынках развіваць прадукцыю*

Анатоль Дунда з Арэшкава рашыўся заснаваць дрэваапрацоўчае прадпрыемства і прыняць на працу да 10 асоб. Дзеля гэтага збудаваў гаспадарчыя будынкі. Пасля закалотаў з паркам і запаведнікамі Белавежскай пушчы стрымаўся з рэалізацыяй сваёй задумы.

### *Пасля закалотаў з Белавежскай пушчай*

— Стрымаўся я з інвестыцыямі, бо не ведаю як вырашыцца справа гаспадаркі драўнінай у Белавежскай пушчы. Апошнім часам выдатна павысіліся цэны на лясную сыравіну. Буйныя прадпрыемствы з-па-за Гайнаўскага павета купляюць вялікія колькасці драўніны і таму атрымліваюць льготы ў цэнах. Калі б нават усе мясцовыя прадпрымальнікі з Гайнаўшчыны сабраліся, каб купіць лясную сыравіну, то не ў змозе заказаць такой колькасці дрэў, якую купляе аднаразова вялікі прадпрымальнік з Польшчы, — заяўляе Анатоль Дунда. — Цяжка мне зараз рашыцца на канкрэтную прадукцыю і ўзяць вялікія крэдыты на куплю дарагіх машын, калі не ведаю які будзе доступ да лесаматэрыялаў. Калі б нельга было купіць драўніну ў Белавежскай пушчы, мне цяжка было б ездзіць за сыравінай у Беларусь або далёка ў Польшчу. Дарагі транспарт рабіў бы маю прадукцыю малапрыбытковай.

### *Вяртаецца мода на драўляныя прадукты*

Апошнім часам людзі пачалі пазбягаць пластмасавых матэрыялаў, якія выконваюцца з выкарыстаннем хімікатаў. Пасля звыш дзесяцігадовага перапынку ізноў вяртаецца мода на драўляныя будаўнічыя матэрыялы і таму для прыпушчанскіх прадпрымальнікаў ёсць шанц разгарнуць прадукцыю. Спадар Дунда хацеў бы прадукаваць драўляныя панелі, паркет на падлогі і драўніцу на дамы. У яго гаспадарчых будынках знаходзіцца толькі некалькі старых машын для апрацоўкі драўніны. Спадар Анатоль самастойна правёў капітальны рамонт. Побач шліфавальнага станка стаіць чэшскі матацыкл „ЦЗ-350", які таксама прайшоў капітальны рамонт. Мой суразмоўца паказвае мне пустое памяшканне для ручной апрацоўкі драўніны. Каля ўваходу ў будынак знаходзіцца сацыяльны пакой для адпачынку і кацельня. Тлумачыць ён, што ва ўсіх памяшканнях трэба мантаваць электраўстаноўку, санітарнае абсталяванне і падрыхтаваць будынак да абагравання. Усе гэтыя работы патрабуюць значнай колькасці грошай.

Раней спадар Дунда вёў паслугова прадпрыемства. Выконваў у прыватных дамах драўляныя лесвіцы, клаў паркеты і драўляныя насценныя панелі. Працаваў ён часта ў Варшаве, дзе цэны на паслугі былі ў тры разы вышэйшыя за гайнаўскія.

— Пасля на варшаўскім рынку паявіліся працаўнікі з-за ўсходняй мяжы і зацікаўленне драўлянымі вырабамі паменшала. Дайшло да таго, што ў Варшаве плацілі за выкананне драўлянай лесвіцы менш, чым у Гайнаўцы. Паколькі я працаваў сам, спыніў сваю дзейнасць і заняўся гаспадаркай, — гаворыць Анатоль Дунда. Зараз на 8 гектарах поля сее ён збожжа і садзіць бульбу.

### *Як абаграваць вялікія дамы?*

Непадалёк ад вуліцы стаіць велізарны шыкарны дом Анатоля Дунды, збудаваны яшчэ ў іншай гаспадарчай рэчаіснасці, з дапамогай бацькоў. Жыхары прыпушчанскай вёскі не звярталі тады ўвагі на кошты абагравання сваіх дамоў. Непадалёк ад Арэшкава распачынаецца пушча і раней можна было прывозіць танныя дровы для абагравання кватэр. Апошнім часам няма таннай лесасыравіны і таму дамы часта абаграваюцца адкідамі з дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Калі іх не стане, цяжка будзе абаграваць велізарныя двухпавярховыя дамы, якія знаходзяцца ў Арэшкаве.

Панадворак у спадара Дунды вялікі, бо дакупіў ён частку панадворка ад суседа. Навёз на яго каля 60 прычэпаў зямлі і выраўняў тэрыторыю з абодвух панадворкаў. Адрамантаваў старое гумно і каля яго выкапаў сажалку. Завёў там гадоўлю рыб і плануе збоку зрабіць месца для адпачынку.

### *Ці пушча створыць шанц для маладых?*

Раней жыхары іншых мясцовасцей куплялі ў Арэшкаве старыя хаты з участкамі поля. Апошнім часам продаж дамоў стрымалася. Людзі лічаць, што павялічацца на іх цэны. Малодшыя гаспадары, якія працавалі дадаткова ў лесе або ў Гайнаўцы, збудавалі прыгожыя вялікія дамы. Рашыліся жыць у Арэшкаве, бо тут чыстае паветра і блізка да Белавежскай пушчы. Можна хадзіць у лес за грыбамі і ягадамі. Пенсіянеры і асобы, якія асталіся апошнім часам без працы, карыстаюцца нагодай і папаўняюць сямейныя бюджэты сродкамі, што атрымліваюць ад продажу лясных прадуктаў.

— У Арэшкаве кожны бярэ справы ў свае рукі і нешта робіць. Засталіся жыць маладыя гаспадары і яшчэ бурліць жыццё. Тыя гаспадары, што маюць свае сельскагаспадарчыя машыны, выконваюць паслугі суседзям. Аднак не ведаем, што будзе з пушчай і гэта нас сумуе. Ніхто з намі не гаворыць пра ахову лесу і магчымасці карыстання яго дабрадзействамі. Мы б згадзіліся на большую ахову, калі б нам гарантавалі, што будзем маглі купляць у пушчы дровы і лесасыравіну для дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, а будзе абмежаванне яе вывазу па-за Гайнаўскі павет. Важна, каб гаспадар мог заехаць у лес і без афармлення спраў у Гайнаўцы купіць дровы ў ляснічага, — разважае Анатоль Дунда. — Пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз не заўважыў я станоўчых рэзультатаў для прадпрымальнікаў.

**Аляксей Мароз**

# Орля дапамагла шпіталю

Сяляне з Арлянскай гміны бясплатна ахвяравалі бульбу і гародніну бельскаму шпіталю. Узамен лекары будуць да канца года бясплатна праводзіць медыцынскія абследаванні на тэрыторыі Арлянскай гміны.

У другой палове кастрычніка пасобныя салэцтвы, якіх у гміне 22, правялі акцыю зборкі караняплодаў у карысць бельскага шпіталя. Такім чынам удалося сабраць 25 тон бульбы; некаторыя сяляне ахвяроўвалі таксама гародніну. У сярэднім жыхары кожнай вёскі перадалі па дзвацаць мяшкоў; найбольш ахвяравалі земляробы з Крывятыч — 67 мяшкоў, і з Малінннік — 50. Усё гэта гмінны „Камаз" завёз у шпітальны склад. Дзякуючы гэтым ахвяраванням бельскі шпіталь, які патрабуе штогод 28 тон бульбы, зможа карміць сваіх хворых чарговы год.

Бельскі шпіталь задоўжаны, цяпер пагашае два крэдыты вартасцю ў 900 тысяч злотаў, а грошы патрэбныя на куплю і рамонт неабходнай апаратуры ды на рамонт будынка, якому больш за трыццаць гадоў. Паменшалі шпітальныя харчавальныя рацыёны.

У мінулым годзе шпіталь атрымаў вялікую дапамогу з Бельскай (сельскай), Рудчанскай і Вышкаўскай гмін — 28 тон бульбы і 3,9 тон гародніны. Дапамагаюць шпіталю мясцовыя ўлады, прадпрымальнікі і прыватныя асобы. Сёлета, раней, Арлянская гміна паставіла ў шпіталь некалькі самазвалаў жвіру для засыпання былога супрацпажарнага басейна. **(мм)**

# У Гродзенскай філармоніі

*Усе нашы мастацкія калектывы прадэманстравалі ў Гродне тое, што на Беласточчыне жыве беларускае слова, песня і музыка, што жыве беларускасць...*

У Польшчы дзейнічае Беларускае грамадска-культурнае таварыства, а на Беларусі — Саюз палякаў Беларусі. Пачынаючы з 1993 года па ініцыятыве ГП БГКТ адбываюцца „Артыстычныя сустрэчы Беласток — Гродна”, паперамена ў абодвух гарадах, як фестывалі культуры беларускай меншасці ў Польшчы і польскай меншасці ў Беларусі. Фестывалі маюць вялікае значэнне для ўзаемнага пазнання культур меншасцей і ўзбагачэння суадносін паміж дзвюма нашымі меншасцямі.

Фестывалю заўсёды спадарожнічае міжнародная навуковая канферэнцыя „Шлях да ўзаемнасці”. Сёлета адбылася яна 11 і 12 лістапада, а 13 лістапада ў Гродзенскай філармоніі прайшоў XII Міжнародны фестываль „Артыстычныя сустрэчы Гродна — Беласток”, арганізаваны Упраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама і Галоўным праўленнем БГКТ. Распачаўся фестываль прывітальнымі і пажадальнымі прамовамі: Людмілы Кадзевіч — дырэктара Упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, Яна Сычэўскага — старшыні ГП БГКТ і Станіслава Пажэцкага — намесніка старшыні Саюза палякаў Беларусі. Прамоўцы падкрэслівалі значэнне ўзаемнага пазнання дасягненняў мастацкай самадзейнасці абедзвюх мяншынь.

Затым на сцэну ўвайшлі вядучыя канцэрт: ад Саюза палякаў Яўген Калодзін (ён аб'яўляў выступленні самадзейных артыстаў на польскай мове), а ад ГП БГКТ Ева Ласкевіч (на беларускай мове). Усе калектывы праспявалі па дзве песні.

Пралогам канцэрта была песня „Беларусь — імя святое” ў выкананні Алы Каменскай і Народнага самадзейнага калектыву „Бліскавіца” Гродзенскіх электрычных сетак.

А пасля меладыйна паплылі словы вялікага беларускага паэта Якуба Коласа:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз, утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны мае убогай,*
*К табе я ў думках залятаю*
*І там душою спачываю.*

З такой прыгожасцю, з такой чуллівасцю і нейкай асаблівай сардэчнасцю спявалі „Прымакі”, а асабліва Юрка Астапчук, што моцна ўзрушыла публіку.

Беларускія калектывы „Крыніца” з Беластока, „Рассяпаны Гарадок” (мастацкі кіраўнік абодвух гуртоў — Віктар Маланчык), хор Гайнаўскага дома культуры (мастацкі кіраўнік Аліна Негярэвіч), „Васілёчкі” з Бельска-Падляшскага (мастацкі кіраўнік Мікалай Мяжэнны) і „Каласкі” з Беластока (мастацкі кіраўнік Ала Каменская) ды нашыя не так даўно паўсталыя харавыя калектывы „Лучына” з Беластока (мастацкі кіраўнік Гражына Валкавыцкая) і „Куранты” з Бельска-Падляшскага (мастацкі кіраўнік Аліна Негярэвіч) выдатна паказалі сваё мастацтва. Гэта адносіцца таксама да зусім маладога танцавальнага гурту Гайнаўскага дома культуры „Перапёлка” (мастацкі кіраўнік Анна Баран), танцы якога ўсім прыпалі даспадобы і таму танцоры атрымалі такія моцныя апладысменты.

Усе нашы мастацкія калектывы прадэманстравалі ў Гродне тое, што на Беласточчыне жыве беларускае слова, песня і музыка, што жыве беларускасць сярод старэйшага і маладога пакаленняў.

Польскія хоры задавальнялі душэўныя нацыянальныя запатрабаванні на родную песню, музыку і танец прыбылых на канцэрт мясцовых палякаў. У некаторых песнях адчувалася туга па этнічнай радзіме і любоў да яе. Песня „Полеся чар”, якую выканаў хор „Глос з-над Немна” з Гродна пад мастацкім кіраўніцтвам Паўла Кмеціка і песня „Кохам це Польско” Вакальнага ансамбля народнай песні „Зарачанскія крынічкі” (мастацкі кіраўнік Людміла Панкрат) Зарачанскага ЦДК Гродзенскага раёна, выкананы былі вельмі прыгожа, па-майстэрску. На высокім мастацкім узроўні выконваліся таксама польскія народныя песні „Чырвона ружа трояка” і „В зелёным гаіку”. Спяваў іх фальклорны гурт „Одродзэнэ” Васілішкаўскага ЦДК Шчучынскага раёна (мастацкі кіраўнік Тэрэза Насута).

Народныя хоры „Івенка” Іўеўскага РДК (мастацкі кіраўнік Іосіф Януковіч) і Народны хор польскай песні „Промень” (мастацкі кіраўнік Эдвард Гайдукевіч) Шчучынскага РДК таксама належна справіліся з рэпертуарам.

Вялікім зацікаўленнем прысутных карысталіся танцавальныя ансамблі. І так Узорны ансамбль песні і танца „Ютшэнка” Ваўкавыскага РДК (мастацкі кіраўнік Ала Пакачайла) прадставіў вармінскія танцы. Пяць пар маладых людзей спрытна танцавалі, а чатыры асобы спявалі.

Дзіцячы ансамбль танца „Радуньске словікі” СШ № 1 мястэчка Радунь Воранаўскага раёна (балетмайстар Святлана Андзюлевіч) выступіў з падляшскімі танцамі, а дзіцячы эстрадны ансамбль „Анжэліка” Лідскага Польскага дома (мастацкі кіраўнік Анжэліка Бірук — яе імя стала назвай ансамбля) — таленавіта выступіў з рок-н-ролам. А эстрадны аркестр СШ № 36 надта прыгожа выканаў песні „Ноцэ і днє” і „Польске квяты”.

Паказана была яшчэ гумарыстычная мініяцюра маладзёжнага тэатра Саюза палякаў у Гродне „Паланез”. Пасля дзвюх з палавінаю гадзін канцэрт набліжыўся да канца.

У фінальную частку фестывалю ўвайшлі дзве песні: „Пенкна наша Польска цала” і „Люблю наш край, старонку гэту”. Спявалі іх усе калектывы пад дырыжорствам Алы Каменскай (на здымку). Усе людзі ў зале падняліся з крэсел і многія стоячы спявалі разам з самадзейнікамі. Затым пайшлі доўгія развітальныя апладысменты і публікі, і самадзейнікаў.

Будзе што ўспамінаць з удзячнасцю. Ёсць за што дзякаваць арганізатарам фестывалю. З багатымі ўражаннямі гродзенцы адправіліся дамоў, госці з Беласточчыны паехалі на вячэру, а пасля на аўтобусах адправіліся на граніцу, а затым у Беласток.

**Міхась Хмялеўскі**




*У фінальную частку фестывалю ўвайшлі дзве песні: „Пенкна наша Польска цала” і „Люблю наш край, старонку гэту”*

22 лістапада 2004 г. на 49 годзе жыцця памёр **Аляксандр ІВАНОЎСКІ** — былы намеснік старшыні Галоўнага праўлення БГКТ у 1988-1991 гг.
Словы шчырага спачування сям'і Нябожчыка з прычыны напаткаўшага Іх гора — смерці мужа, бацькі, брата і сына выказваюць сябры.

19 лістапада 2004 года на 46 годзе жыцця раптоўна памёр **Міраслаў АНДЖЭЮК** — камендант Добраахвотнай пажарнай каманды ў Бандарах, шафёр, механік, арганізатар беларускіх фэстаў на Бандарскім пасёлку.
Словы шчырага спачування жонцы, дочкам, і сям'і з прычыны напаткаўшага Іх гора выказваюць члены Добраахвотнай пажарнай каманды ў Бандарах, жыхары пасёлка Бандары і вёскі Рыбакі.

## Што з законам

*Прыняты 4 лістапада г.г. закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды рэгіянальнай мове выклікаў шмат каментараў і дыскусій. Асяроддзі пражываючых у Польшчы нацыянальных меншасцей прымаюць з задавальненнем прыняцце Сеймам гэтага закону, аднак занепакоілі іх пазіцыі шмат якіх прамінентных польскіх палітыкаў, якія супрацьпаставіліся законнай рэгуляцыі спраў важных для меншасцей, — кажа дэпутат-спікер гэтага закону Яўген Чыквін. — Датычыць гэта спробы ўчынення з польскіх грамадзян, якія прыналежаць да меншасцей, „заложнікаў” сітуацыі палякаў, якія пражываюць за межамі польскай краіны. Згодна з прэзентаванай шэрагам палітыкаў Лігі польскіх сем'яў, Права і справядлівасці, ПСЛ, правых колаў пазіцыяй, эвентуальнае прызнанне правоў меншасцям пражываючым у Польшчы павінна быць залежнае ад прызнання такіх правоў палякам у суседніх краінах. Апроч таго гучаць інсінуацыі аб уяўнай пагрозе, якую нацыянальныя і этнічныя меншасці могуць прыносіць інтарэсам польскай дзяржавы. Выразам такіх поглядаў былі спробы паўтарэння ў законе абавязкаў, якія на кожнага грамадзяніна накладвае Канстытуцыя РП, а таксама інсінуацыі аб быццам бы прывілеяваным становішчы меншасцей у палітычна-грамадскім жыцці краіны. Вось, напрыклад, дэпутат Антоні Стрыеўскі патрабаваў выявіць маршалкам асобы, палітыкаў, дырэктараў банкаў, дырэктараў устаноў культуры і іншых установ паводле іх нацыянальнасці. Прыняццё Сеймам пададзеных Грамадзянскай платформай паправак, якія элімінуюць магчымасць ужывання мовы меншасці як дапаможнай у гмінных установах і павышэнне ліміту ліку жыхароў гміны, у якой эвентуальна маглі б прымяняцца падвойныя назвы мясцовасцей і вуліц да 50% ад усяго насельніцтва, у маёй ацэнцы было непрыязным жэстам у адносінах да важных для меншасці правоў. Сенатары СЛД, што здакляравала кіраўніцтва Клуба, у час прац над законам у Сенаце будуць старацца вярнуць першапачатковыя запісы.*

*Закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях уводзіць м.інш. наступныя новыя правілы і рэгуляцыі: называе дэфініцыю „нацыянальнай меншасці” і „этнічнай меншасці”; упарадкоўвае і збірае ў адным акце распыленыя правы асоб, якія належаць да нацыянальных і этнічных меншасцей (выразна вылучана толькі асветнае права); гарантуе права на свабоднае вырашэнне грамадзяніна трактаваць яго як асобу, якая належыць альбо не належыць да нацыянальнай меншасці і ўстанаўлівае, што ніхто не можа быць абавязаны да доказвання ўласнай прыналежнасці да дадзенай меншасці; прымае шэраг дэталёвых запісаў Рамачнай канвенцыі Савета Еўропы аб Ахове нацыянальных і этнічных меншасцей, сярод гэтага — забараняецца прымяняць сродкі, якія мелі б на мэце асіміляванне асоб з меншасці, калі тыя сродкі прымяняюцца супраць іх волі, забараняецца прымяняць сродкі, якія б мелі на мэце змяніць нацыянальныя ці этнічныя прапорцыі на тэрыторыі дзе пражывае меншасць; уводзіцца катэгорыя „рэгіянальнай мовы” і акрэсліваюцца правы асоб, якія ёю карыстаюцца; уводзяцца і дэталёва рэгулююцца моўныя правы нацыянальных і этнічных меншасцей (гарантыя свабоднага карыстання мовай меншасці ў прыватным жыцці і публічна, дапаможная мова, падвойныя тапаграфічныя і фізіяграфічныя назвы, назвы вуліц і інш.); уводзіць розныя антыдыскрымінацыйныя запісы; суб'ектныя датацыі на грамадска-культурную дзейнасць меншасных арганізацый; называе орган урадавай адміністрацыі адпаведны для спраў ахопліваных законам (міністр па справах веравызнанняў і нацыянальных і этнічных меншасцей); стварае Супольную камісію ўрада і нацыянальных і этнічных меншасцей як дарадчы орган старшыні Рады Міністраў.* **(лук)**

Зорка
для дзяцей і моладзі



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК



*Дзеці з Пачатковай школы ў Гарадку*

# Музей у Гарадку

У Пачатковай школе ў Гарадку адкрылі Ізбу традыцыі. Гэтая падзея адбылася ў Свята школы, якое адзначаюць у лістападзе ў гонар прыняцця школьнага сцяга. Гэтым разам святкаванне праходзіла пад лозунгам „Школа дзядоў, бацькоў і мая”.

19 лістапада г.г. зранку пачалі прыязджаць госці. Не толькі дарослыя. Прыехалі дзеці са школы ў Шымках у суседняй Міхалоўскай гміне. Былі, вядома, выступленні дзяцей і старэйшых школьнікаў. Лёгка і жартаўліва дзеці запрэзентавалі моду. Прэзентацыя мела шырокі абсяг — ад часоў каменнай эпохі, праз часы фараонаў, пасля мы завіталі ў старажытны Рым, затым у сярэднявечча, ды ў класіцыстычную эпоху. Сучасная мода была прымеркаваная да 70-х гадоў XX стагоддзя і да сённяшняга дня.

Цікава, што дзеці любяць паўтарць прыклады, паказаныя па тэлебачанні.

У духу сучаснасці выступіў таксама IV „а” клас, які паказаў сучасны танец.

Адной з цікавейшых частак праграмы былі, несумненна, „Гульні і песні з мінулага”. Гэта падарожжа ў моўны казачны свет бабуль і дзядуляў. Прыказкі, прымаўкі, лічылкі, песні і танцы. Дзеці, натуральна, пераходзілі з польскай на беларускую мову, часам той самы верш або загадку яны прадстаўлялі на абедзвюх мовах.

Энергічна і бойка атрымалася песня і танцы пад народную песню „Ехаў Ясь на кані”.

— Калі я вучыла дзяцей беларускіх вершаў, я заўважыла што ўсе яны добра разумеюць беларускую мову, — кажа настаўніца Тамара Бялькевіч. — Нават тыя, якія не ходзяць на ўрокі.

Сапраўды, калі дзеці выступілі на сцэне, адчувалася, што спадчына, якую яны прыпісваюць пакаленню дзядоў, ім таксама блізкая і падабаецца.

* * *

Ізба традыцыі — гэта гісторыя школы. На фотаздымках дзеці могуць адшукаць сваіх бацькоў, сваякоў ды нават дзядоў.

— Адкуль думка паказаць гісторыю школы?

— Найбліжэйшы музей 60 кіламетраў ад Гарадка, — кажа дырэктар школы Вера Тарасевіч. — А тут, сярод экспанатаў, будзе можна праводзіць урокі гісторыі, ці запрасіць паэта або наладзіць школьную ўрачыстасць.

Школьны музей арганізаваўся пад кірункам спадарства Альжбеты і Яраслава Грэсяў, а дапамагалі ўсе настаўнікі і вучні.

Калі ідзе пра апошніх — найбольш напрацаваліся вучні пятага класа — яны атрымалі ўзнагароду дырэктар школы.

У Пачатковай школе ў Гарадку 281 вучань і кожны пяты вучыцца беларускай мове. **Зорка**

## *Добры дзень, дарагая „Зорка”!*

Пішуць Табе вучні IV і V класаў Пачатковай школы н-р 6 у Гайнаўцы. Мы хочам падзякаваць за тое, што Ты, „Зорка”, наведала нашу школу. Мы вельмі чакалі Цябе і хваляваліся. Мы рады гасціць Цябе яшчэ раз. Вельмі прыемна было разгарнуць „Зорку” і пабачыць сябе на Тваіх старонках. Да сустрэчы!

# Боцікі паўночныя

(працяг; пачатак у 47 нумары)

Асабліва абурыў паню Караліну сад. А між тым у маёнтку сад меўся цудоўны. Кусты язміну і бэзу плылі, як бела-блакітныя караблі, ружы ўтваралі дзівосныя піраміды вакол аплеценых лазой калонаў. А клумбы! Якія толькі малюнкі не ўтвараліся з рознакаляровых кветак! Асабліва прыгажэў сад увесну, калі квітнелі яблыні і вішні, якіх багата было насаджана. Даглядаў за садам малады Гальяш. Быў ён родам з вёскі, са звычайнай сялянскай сям'і. Але надзіва разумны і кемны. Нават вывучыўся чытаць у дзячка з нашае царквы. А гожы які! За гожасць і ўзялі яго яшчэ хлопчыкам слугаваць у маёнтак, дзе ён адразу прыбіўся да старога садоўніка-немца. Так у Гальяша спрытна артымлівалася садоўніцкая справа, што немец шчыра палюбіў хлопчыка, вывучыў усяму, што сам ведаў. І пасля смерці настаўніка Гальяшу даручылі панскі сад.

Але паню Караліну не ўсцешылі прыгожыя кветкі. Яна дакладна ведала, якім мусіць быць яе сад, і нават мела малюнак з нейкай кнігі — раўнюткія дарожкі, раўнюткія лініі кустоў, падстрыжаных пад грабеньчык, быццам цагліны. Належала толькі выпісаць з-за мяжы майстра... Але запярэчыў пан. Навошта траціць вялікія грошы? Няхай пані перадасць свой малюнак іх садоўніку, чалавеку простаму, але здольнаму. А той усё і зробіць.

Якое ж было здзіўленне пані, калі перад ёй паўстаў гожы, як малады кароль, юнак з цёмнымі праніклівымі вачыма, ды яшчэ звярнуўся да яе на ейнай мове! Але гаварыў ён неадпаведнае. Маўляў, не варта знішчаць своеасаблівую прыгажосць сада. А ссякаць квітнеючыя дрэвы ў гэтых краях увогуле ўважаецца за страшэнны грэх. Пані глядзела на Гальяша, і ўпершыню ў яе рысах можна было прыкмеціць адценне пачуцця. Якога? Складана сказаць. Чалавек часта сам не можа разабрацца ў сваіх пачуццях. Гнеў, трывога, здзіўленне, яшчэ нешта... Гэтак жа незразумела ззялі і вочы маладога садоўніка.

Пані стаяла на сваім. Сад мусіць быць пераўтвораны. Тады Гальяш прапанаваў — няхай дадуць яму месяц, і ён зробіць у садзе такое дзіва, што пані сама не захоча гэта знішчаць.

Чаму пані пагадзілася? Уся прыслуга гадала — не магла даўмецца, чым кранула ільдзяное сэрца гаспадыні садоўнік. Гальяш працаваў апантана, нават начаваў у садзе. Ці толькі сваё ўладанне ён хацеў абараніць, ці ставіў яшчэ якуюсь мэту? Хто ведае. Хіба толькі тыя кветкі, якія ўласнымі рукамі ставіла пані кожны дзень у вазу на сваім століку.

(працяг будзе)

**Людміла Рублеўская**

Фота Ганны Кандрацюк



## Польска-беларуская крыжаванка № 48

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 44**: Як, жабка, расказ, курка, лістапад, мора. Ежа, кіно, абрус, карта, Аскар, капач, Ас, азадак.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Аня Селеванюк** з Бельска-Падляшскага, **Юліта Скепка** з Нараўкі, **Іаанна Казёл** і **Сільвія Лісавец** з Гарадка, **Паўліна Мялешка**, **Рафал Тамашук** і **Эля Шарэйка** з Дубін, **Павел Чурак** з Арэшкава, **Анна Раманюк** і **Наталля Эльвіра Ялоза** з Гайнаўкі. Віншуем!



*Вучні нараўчанскай школы на магіле свайго патрона*

## Запалілі лампадкі

Восень — вельмі прыгожая пара года, асабліва, калі свеціць сонца, а на дрэвах красуецца каляровае лістоўе. На ўроках роднай мовы мы гаварылі аб колерах восені, садавіне, агародніне і працы людзей. Найбольш спадабалася нам гульня „Агароднік". Прыйшоў таксама час на размову аб свяце „Дзяды". Пры нагодзе мы шмат цікавага даведаліся пра патрона нашай школы Аляксандра Валкавыцкага — настаўніка і дырэктара, якому блізкай была справа асветы. Ён загінуў у 1945 годзе з рук банды, якая загубіла таксама многа іншых людзей. Карыстаючыся цудоўным сонечным надвор'ем, мы пайшлі на могілкі, якія знаходзяцца непадалёк нашай школы і ў знак памяці запалілі лампадкі на магіле патрона. Мы былі тут першымі, але на магіле хутка загарацца наступныя лампадкі, бо прыйдуць сюды вучні іншых класаў. Перад святам прыйдзем на магілы сваіх блізкіх. Трэба памятаць аб тых, што адышлі ў вечнасць.

***Ася, Марта, Юліта, Юстына, Аня, Караліна, Дарэк, Куба і Кшысь з Нараўкі***

**Час рыцараў**

## Пасвячэнне ў рыцары

Калі наш кандыдат у рыцары ўмела карыстаўся мячом і ведаў добрыя манеры, нарэшце мог перайсці абрад пасвячэння ў рыцары. Не ўсе хлопцы маглі хутка дасягнуць гэтую мэту, некаторыя ставалі ў рыцарскія рады ўжо каля саракоўкі.

Рыцарам быць — гонар і прэстыж. Але не дарунак лёсу — на ўсё трэба было запрацаваць.

Абрад пасвячэння часта здзяйсняў сам кароль. У замку ладзілі вялікую ўрачыстасць, якая зацягвалася некалькі дзён або і ўвесь тыдзень. Разам з новапастрыжаным рыцарам святкавалі яго сваякі і прыгонныя.

У каляду да ўрачыстага пасвячэння наш кандыдат брыўся, купаўся ды ішоў на ўсяночную багаслужбу.

Раніцай апранаўся ў найлепшае адзенне і са святочным хваляваннем ступаў перад аблічча караля.

Кароль дарыў прынятаму ў рады дружыннікаў раней высвечаны меч і шпоры ды сам пасвячаў рыцара.

Навічок-рыцар прысягаў верна служыць свайму пану, бараніць слабейшых ды жанчын.

Пасля цырымоніі ладзілі вясёлыя гульні і танцы, дзе мёд і віно ліліся разліўною ракой.

Гэты дзень усе павінны былі захаваць у памяці!

(працяг будзе)

**Зорка**

## *Вершы Віктара Шведа*

### *Карусель*

*Звяртаецца Данель:*
*— Татка мой харошы,*
*Прашу, на карусель*
*Дай мне сёння грошы.*

*— Хоць вольны ў нас дзянёк,*
*Сёння святой нядзелькі,*
*Ці ж мала табе, сынок,*
*Што круціцца Зямелька?*

### *Яшчэ ж чую*

*Маці просіць ізноў:*
*— Дарагі Паўлуша,*
*Шкада маіх горкіх слоў,*
*Памый ты нарэшце вушы.*

*На гэты матулін папрок*
*Знайшоў ён развязку такую*
*І растлумачыў сынок:*
*— Яшчэ ж, мама, я добра чую!*

# 20 год „Крыніцы”

Дваццаць год жыцця чалавека з’яўляецца значным перыядам, а столькі ж год карыснай працы чалавека заўсёды дае вымерную карысць. А калі гэтая праца бясплатная, грамадская, яна тады набывае іншую ацэнку, значна вышэйшую, высакародную. Такой ацэнкі заслужыў хор Галоўнага праўлення БГКТ у Беластоку „Крыніца”. 6 лістапада святкаваў ён свой юбілей, 20-годдзе артыстычнай дзейнасці. Так як з крыніцы выплывае чыстая, здаровая і жыватворная вада, так з хору „Крыніца” плыве ў народ беларускі дух, нашая нацыянальная, беларуская песня, якая прывівае любоў і пашану да прыгожага роднага слова, да беларускіх песень і гэтым самым да беларускай культуры. Сотні гадзін прысвечаных беларускай песні можна назваць своеасаблівай пачэснай працай, якая выконваецца на грамадскіх пачатках, з патрэбы душы, у будні і святочныя дні, ва ўсіх порах года. Мноства гадзін адведзеных на рэпетыцыі, канцэрты, гастролі ў блізкіх і далёкіх мясцовасцях, частыя начныя вяртанні дамоў, ды многія недаспаныя ночы і ўсе іншыя нявыгады не знеахвочваюць харыстаў. На працягу ўсіх 20 год людзям „Крыніцы” характэрная адданасць беларускай справе. Магчыма, што харысты „Крыніцы” самі да канца не ўсведамляюць таго, якую аграмадную работу выконваюць у пашырэнні беларускай нацыянальнай свядомасці, беларускай тоеснасці, беларускага патрыятызму. Слава Вам, дарагія ўдзельнікі „Крыніцы”. Вы ўносіце вялікі ўклад у вялікую справу нашай нацыянальнай годнасці. Так аб заслугах „Крыніцы” для нашай нацыянальнасці гаварыў, адкрываючы ўрачысты канцэрт, старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі. Ён адначасова сардэчна прывітаў прыбылых на ўрачыстасць беларускіх дыпламатаў, прадстаўнікоў улад усіх ступеняў, прадстаўнікоў арганізацый, установ і спонсараў. Асабліва сардэчна прывітаў ён амбасадара Беларусі ў Польшчы Паўла Латушку з жонкай, генеральнага консула РБ у Беластоку Леаніда Каравайку і беластачан, якія запоўнілі залу Гарнізоннага клуба па вуліцы Кавалерыйскай.



Фота ВОЛЬГІ ГУБЭР

Удзельнікі хору „Крыніца”: Люба Гаўрылюк, Ірэна Семянковіч, Антон Семянковіч, Валянціна Ласкевіч, Галена Арцішэўская, Аркадзь Арцішэўскі, Яўген Матвяюк, Ірэна Паўлючук, Уладзімір Іванюк, Аляксандр Максімовіч, Леаніда Снарская, Вольга Губэр, Валянціна Бараноўская, Антаніна Галубовіч, Анна Лук’янюк, Віктар Лук’янюк, Анатоль Ціханюк, Валянціна Грыка, Людміла Радзішэўская, Галіна Цімашыцкая, Мікалай Вярбіцкі, Ян Вярбіцкі, Яўген Грэсь, Ева Казачук, Віктар Маланчык, Вера Міхальчук, Данута Шымчык.

І распачалося галоўнае. На сцэну ў беларускіх народных касцюмах пад апладысменты публікі, увайшоў юбіляр — хор „Крыніца” пад мастацкім кіраўніцтвам Віктара Маланчыка з Гродна, і адразу паплыла мілагучная песня:

*Ах як прыгожа, што ў нас сягоння свята,*
*На сэрцы радасна і хочацца спяваць,*
*Пра тое, чым душа славянская багата,*
*Сябрам мы хочам у сваіх песнях расказаць.*

Публіка гэтую і наступныя песні ўспрыняла моцнымі воплескамі. Адчувалася, што жыхары Беластока любяць песні на роднай мове, што яны даюць ім душэўную асалоду.

„Крыніца” выканала таксама аднайменную песню, якая стала гімнам хору і з якой пераважна пачыналіся канцэрты:

*Ой, у полі крыніца,*
*Там халодна вадзіца,*
*Там журавель воду піў*
*Не напіўся скалацій.*

Вяла ўрачыстасць сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч. Яна пазнаёміла прысутных з гісторыяй калектыву і правяла кароткае цікавае інтэрв’ю з заснавальніцай „Крыніцы” Любай Гаўрылюк і арганізацыйным кіраўніком хору Галенай Арцішэўскай.

У канцэрце паспяхова выступіў маладзёжны хор „Лучына” пад кіраўніцтвам Гражыны Валкавыцкай. Ганар удзельнічаць у святочным канцэрце меў таксама гурт „Лідэр” пад мастацкім кіраўніцтвам Яна Кавальскага. Вядомая песня „Вёсачка”, як заўсёды, атрымала гучныя апладысменты. Вялікім атракцыёнам канцэрта было выступленне славутага гурту „Лявоны” з Воранава, што на Беларусі, пад мастацкім кіраўніцтвам Вячаслава Мацкевіча. Сем мужчын, спяваючых і адначасна іграючых на народных музычных інструментах, выклікалі вялікае ўражанне ў беластачан, якія паасобныя песні ўзнагароджвалі бурнымі воплескамі. Пасля на сцэне зноў з’явілася „Крыніца”. На іх тварах свяцілася радасць. У гэты вялікі, юбілейны дзень хор, на маю думку, спяваў найпрыгажэй.

Варта падкрэсліць той факт, што юбіляр быў высокаўшанаваны. Атрымаў ён Ганаровую грамату Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Ганаровую грамату Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў РБ. Люба Гаўрылюк была ўзнагароджана міністрам культуры Рэспублікі Беларусь „Нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі»”, а Галена Арцішэўская — Ганаровай граматай Міністэрства культуры РБ. Усе вышэйназваныя ўзнагароды ўручалі надзвычайны і паўнамоцны амбасадар Беларусі ў Польшчы Павел Латушка і генеральны консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка. Павел Латушка ўручыў Любе Гаўрылюк і Віктару Маланчыку каштоўныя рэчавыя ўзнагароды.

Дырэктар Дэпартамента культуры нацыянальных меншасцей Міністэрства культуры Польшчы Ежы Весłаў Завіша ўручыў многагадовым удзельнікам „Крыніцы” — Галене Арцішэўскай, Аркадзю Арцішэўскаму, Ірэне Семянковіч, Антону Семянковічу, Уладзіміру Іванюку і Яўгену Матвеюку адзнакі „Заслужаны дзеяч культуры”. Ён жа ўручыў таксама дыпломы гэтага ж міністэрства Аляксандру Максімовічу, Ірэне Паўлючук, Леанідзе Снарскай.

Віншавальны ліст Падляшскага ваяводы і рэчавую ўзнагароду ўручыў хору віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч, а віншавальны ліст і падарунак ад маршалка Падляшскага ваяводства — дырэктар Дэпартамента адукацыі і культуры Маршалкоўскай управы Галіна Вышкоўская. Калектыў атрымаў таксама Ганаровую грамату ад метадычнага цэнтра Упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. Дэлегацыі дамоў культуры з Бельска-Падляшскага і Гайнаўкі, а таксама хор „Рассяпаны Гарадок” таксама павіншавалі юбіляраў і ўручылі кветкі, а сенатар Сяргей Плева віншаванні для хору „Крыніца” падрыхтаваў у спецыяльным афармленні.

**Міхась Хмялеўскі**

# Чакайце новую смешную кнігу




Праграмная рада тыднёвіка „Ніва” падрыхтавала да друку новы калектыўны зборнік па-беларуску *Ракам у Еўропу*. Гэта збор сатырычных і гумарыстычных тэкстаў — расказаў, навел, фельетонаў, а сярод іх ёсць таксама сатырычная паэма і навагодняя батлейка, якія друкаваліся ў „Ніве” ад пачатку яе існавання да 2000 года. Выбраў творы шматгадовы роэдактар „Нівы”, паэт, публіцыст і сатырык Сідар Макацёр, ён жа і Юрка Зубрыцкі, значыць, Георгій Валкавыцкі. Рэдактар прапануе сярод аўтараў такіх творцаў, як Ян Чыквін, Сакрат Яновіч, Міра Лукша, Міхась Андрасюк, больш вядомых як аўтараў „сур’ёзнай” літаратуры, а таксама дамарослых сатырыкаў, знакамітых назіральнікаў жыцця, якія больш пісалі пад псеўданімамі, такіх як „Дзядзька Квас” (Міхась Красоўскі, селянін з Малынкі), „Сульвэстар” і „Сук” (лістаноша Эдвард Шчасновіч са Шчасновічаў на Сакольшчыне), салёвайпрыбіральшчыцы („Аўрора” — Ірэна Лукша з гайнаўскай бальніцы), чыноўніцы („Цётка Мальвіна” — Анна Яканюк з Бельска-Падляшскага), культуразнаўцы (Мікола Лобач), юрыста („Сава” — Вінцук Склубоўскі), а таксама тэксты вядомых публіцыстаў, м.інш. Віктара Рудчыка („Асака”), Аляксандра Вярбіцкага („Адам Маньяк”) ці адстаўнога вайскоўца Васіля Петручука... Не значыць гэта, усё ж, што гэтыя тэксты — аматарскія. Знакамітая, каляровая мова (з выкарыстаннем падляшскіх гаворак), вобразнасць, дасканалы „агляд” чалавечых заган і клопатаў таго часу, ад вясковай да палітычнай задрыпанасці, праз жарты з „лянівага халопа”, а нават і з „плябана” (у сэнсе „інжынера душ”). Напісаныя яны лёгка, дасціпна. Напэўна, зацікавяць яны чытача не толькі ў Польшчы, а ёсць яны запісам веку ўжо былога, хоць больш з рыс, якія папракаюць ў *Ракам у Еўропу*, „папаўзе” ў гэтую Еўропу разам з намі.

Вось што заўважыў Георгій Валкавыцкі: „Хочаце верце, хочаце праверце, але ішлі мы ў Еўропу паступова і планамерна. Ад самага свайго нараджэння (...), калі Народная Польшча назвала нас беларусамі. І не хвалімся напрамкам, як іншыя новаеўрапейцы. Такі нораў, быць у засені. Дзякуючы яму мы выжылі ў халодным прыцемку дыктатуры пралетарыяту, без вялікіх страт пераадолелі пераходны перыяд і лёгка праслізнуліся ў дэмакратыю. Тут памагла нам другая прыродная рыса — смех. На ім і трымаецца дэмакратыя. Без яго „Ніва” пераўтварылася б у пахавальнае прадпрыемства... У кожнай нацыі — свой заскок. Наш смех ачышчае душу, штурхае на роздумы. Ён і абаронны шчыт і наступальнае джала... Смех — наша здароўе і надзея. Калі смяемся, значыць, жывем”.

Дык чакайма новай смешнай кнігі!

**(лук)**

# Выкладчык і літаратар

**„...коснувшись земли, снова, подобно Антею, чувствовал в себе силу, которая идет только от земли. Он неизменно льнул, горнулся к своему народу, к своей земле...”**



У Свята-Георгіеўскім храме на Жыровіцкіх могілках, на левым баку сцяны знаходзіцца дошка прысвечаная памяці айца Плакіда Янкоўскага. Надпіс на рускай мове: „Родителям протоиерею Плакиду Янковскому (1810-1872) и Елене Янковской (1817-1867). Дети”. У гары дошкі шасціканцовы крыж і пясочны гадзіннік. Унізе — вялікі шэры камень з ініцыяламі Н. J. XII.1867. Камень паставіў а. Плакід на магілу сваёй любімай жонкі Лены. Такія ж самыя ініцыялы калісьці знаходзіліся на камені ў фундаментах іх супольнага гнязда — хаты. На жаль, святар, які вёў набажэнства, не дазволіў фатаграфаваць. Мае далейшыя пошукі магілы Янкоўскага прывялі да таго, што я больш дакладна пазнаёмілася з жыровіцкім перыядам дзейнасці а. Янкоўскага.

**У пошуках ведаў**

Плакід Гаўрылавіч Янкоўскі нарадзіўся 20 верасня 1810 г. у вёсцы Войскай Гродзенскай губерні. Бацька яго быў святаром ва уніяцкім храме. У маладосці служыў пад сцягамі Касцюшкі, а пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай прыняў духоўны сан. Плакід вырас у асяроддзі беларускай шляхты, якая знаходзілася пад уплывам польскай культуры і каталіцызму. Першапачатковую адукацыю атрымаў у бацькоўскай хаце, дзе жыў да васьмі гадоў. Пасля правучыўся год у Свіслацкай гімназіі і закончыў Брэсцкую базыльянскую уніяцкую школу. У 1826 г. вучыўся ў галоўнай семінарыі Віленскага універсітэта на багаслоўскім факультэце для уніятаў і каталікаў. Закончыўшы ў 1830 г. семінарыю са ступенню магістра багаслоўя, Янкоўскі стаў выкладчыкам Літоўскай уніяцкай духоўнай семінарыі у Жыровічах. Вёў лекцыі па лацыні і французскай мове. 20 жніўня 1833 г. атрымаў уніяцкі святарскі сан. У гэты самы дзень ажаніўся з Аленай Тупальскай, дачкой кіраўніка Літоўскай уніяцкай кансісторыі Антона Тупальскага. У 1833 г. Янкоўскі стаў прафесарам Святога Пісання, дагматычнай тэалогіі і нямецкай мовы. У Віленскай духоўнай (рыма-каталіцкай) акадэміі атрымаў ступень доктара тэалогіі.

**Жыццёвы выбар**

У траўні 1835 г. у сям'і Янкоўскіх нарадзіўся першы сын Канстанцін. Малады прафесар ужо ведаў дзе яго месца ў жыцці. Выступаў актыўным праціўнікам уніі. Значны ўплыў на яго аказалі архіепіскап Іосіф (Сямашка), святар Іпаліт Гамаліцкі (рэктар Літоўскай уніяцкай духоўнай семінарыі ў Жыровічах) і Антон Тупальскі. У кастрычніку 1837 г. Янкоўскі выказаў гатоўнасць перайсці на праваслаўе. Яму, як асэсару, далі куратарства над Віленскай губерняй і Беластоцкай вобласцю. Плакід падпісаў канчаткова акт аб ліквідацыі уніі. Спалучэнне Янкоўскага з праваслаўем дало яму поўны давер архіепіскапа Іосіфа (Сямяшкі) і епіскапа Антона (Зубко). Аб гэтым гавораць яго навуковыя і духоўныя ступені: асэсар (1835), віцэ-асэсар кансісторыі (1840), протапрэсвітэр (1837), малодшы, а пасля саборны протаіерэй (1838), залаты нагрудны крыж (1838), ордэн св. Анны другой і трэцяй ступеней, фіялетавая бархатная камілӑўка (1842).

**Вільня і Жыровічы**

Перанясенне Літоўскай семінарыі і кансісторыі ў Вільню ў 1845 г. прымусіла а. Янкоўскага пераехаць у гэты горад. Выязджаў вельмі неахвотна, шкадаваў што пакідае Жыровічы. Служыў у віленскай парафіяльнай царкве ў гонар св. Мікалая. У Вільні а. Янкоўскі быў да 1847 г. У 1846 г. памёр Іпаліт Гамаліцкі, апошні рэктар Жыровіцкай семінарыі. Губляў сваё здароўе і айцец Плакід. На гэты час у яго было сваіх пяцёра дзяцей, а ён яшчэ ўзяў на выхаванне шасцярых сірот Гамаліцкага і сваёй сястры Кацярыны.

**На гары памерці**

Слабое здароўе прымусіла яго ва ўзросце 48 гадоў прасіцца на адпачынак. Перайшоў на пенсію, купіў у Жыровічах дом каля самага манастыра і там пражыў яшчэ 14 гадоў. Пра Жыровічы гаварыў мякка і цёпла: „Гэтае месца настолькі прыгожае, наколькі шчаслівае (...), што кожны раз (...) адпачываю тут цэлымі днямі так радасна, што гавару сабе вечарам: Ох тут бы мне і памерці”. Тое, чаго так хацеў а. Плакід — збылося...

**Любімае роднае**

Плакід Янкоўскі вельмі кахаў свой край, родны куток, усіх землякоў, хатні звычай. Радзіма і яе прыгажосць былі для яго найвялікшай раскошай. Як расліна без сонечных праменняў, як рыба без вады, ён не мог жыць далёка ад свайго краю, ад роднай хаты.

**Літаратурныя замалёўкі**

Цяга да літаратурных заняткаў у Плакіда з'явілася падчас вучобы на Віленскім універсітэце. Значны ўплыў на яго аказалі віленскае асяроддзе і літаратурны гурток. Янкоўскі пачаў правяраць сябе ў прозе і ў паэзіі з 1830-х гадоў, але паважаным пісьменнікам лічыцца з 1840-1850-х гадоў, калі стаў праваслаўным святаром. Выдатна ведаў закуткі сваёй Радзімы: Гродна, Брэст, Навагрудак. Аб іх і пісаў. Свабодна чытаў і пісаў на французскай, нямецкай, англійскай, грэчаскай, чэшскай, яўрэйскай, польскай, рускай, лацінскай мовах. З вяскоўцамі размаўляў на беларускай мове. Пісаў многа, пераважна пра тое, што добра ведаў: мяшчанскую, вясковую і святарскую сферу. Стыль, мова, тэматыка навелаў і аповесцей былі свойскімі, роднымі. З вялікай сімпатыяй ставіўся да простых беларусаў, абараняў іх — залежных ад капрызаў і волі паноў.

Плакід Янкоўскі выступаў пад сваім прозвішчам і пад псеўданімам Джон Дыкальп (John of Dycalp). Жанравая творчасць Янкоўскага даволі неаднародная: мастацкая проза, паэзія, нарысы, пераклады, карэспандэнцыя для газет. Перакладаў на польскую мову Шэкспіра, Гётэ, Мацюні, Пушкіна. Яго пяру належыць каля трыццаці кніг.

**Смерць пры сям'і**

У 1867 г. а. Янкоўскі страціў любімага чалавека і сябра — жонку. Гэтая страта надарвала яго і так ужо слабое здароўе. Жывучы на пенсіі, рэдка выходзіў на шпацыр. Адзінымі яго зацікаўленнямі былі: летам — праца ў агародзе, зімой — кнігі. Памёр 28 лютага 1872 г. на руках сваіх дзвюх дачок і двух сыноў. Паміраў без сяброў, забыты нават тымі, якія раней называлі яго сваім настаўнікам...

**Анна Садоўская**

# Пабачыў усе зоркі

**Успаміны Андрэя КУЧЫНСКАГА, народжанага ў Малешах у 1923 годзе.**

У нашай вёсцы была чатырохкласная школа ў прыватных будынках; пятага класа не было. Я ў чацвёрты клас хадзіў тры гады, бо да чатырнаццацігадовага ўзросту трэба было вучыцца. На чацвёрты год бацька нейкае прашэнне занёс і я ўжо не пайшоў у той самы клас. Настаўнікам быў Фрышэль, паручнік Польскага войска; была і настаўніца. Вучняў „у лапу” білі, на калені стаўлялі. Калі я хадзіў у трэці клас, забраў з сабою малодшага брацікa, то за тое настаўнік мяне на гадзіну ў дымнік усадзіў. Спярша пісалі алоўкам у сшытках, а пасля пёрамі; у парты былі ўпушчаны чарніліцы. Меў я сумку збітую з цалёвых дошак. Пасля школы памагаў бацьку — раскідаў гной, араў, сеяў рукамі, валачыў, жаў: спачатку сярпом, а пасля і касою.

У 1939 годзе з'явіліся ў нас немцы, але неўзабаве адступілі і прыйшлі саветы. Хіба неяк іх віталі, сходы ладзілі. Адну сям'ю забралі бадай у Караганду; маладыя прыехалі назад, а старыя не вярнуліся адтуль. Было двух ці трох ахвотнікаў, што ў шахты падаліся, але зараз адтуль паўцякалі.

Трэба было вазіць камяні пад аэрадромы ў Бельску і Цеханоўцы. Збіраў іх у полі або ў маёнтку ў Антаніне купляў — каб норму вырабіць. Вазіў жалезняком. У Цехановец выязджаў з вечара і ноч ехаў.

Як наступілі немцы, то пад Шпакамі 5-6 бомбаў скінулі. Нашы думалі што манеўры, пабеглі туды і асколкі папрыносілі. Рускія танкі адступалі, за вёскай спыніліся крыху. Неўзабаве немцы на матацыклах прыехалі.

Восенню солтыс вызначыў мяне на работу ў Германію, бульбу шэсць тыдняў збіраць. Заказаў фуры і так нас павезлі ў Беласток; я мо кусочак хлеба на дарогу ўзяў. У Беластоку некаторыя паўцякалі, а я астаўся. Ноч нас патрымалі і завезлі поездам у Ольштын. У першага гаспадара пакапалі 2-3 дні матыкаю і ў лес уцяклі. Нас злавілі, жандар прывёў на чыгуначную станцыю ў Пасым, а адтуль на пастарунак у Шчытна завёз. На другі дзень гаспадар з Міхельсдорфа забраў мяне.

Працаваў я ў яго за два гады. Не даваў мне водпуску і я перайшоў на працу да другога немца. Пабыў у яго мо з месяц і ўцёк. Злавілі мяне і адправілі ў штрафлягер у Дзялдова. Яшчэ не пераступіў парога, як ужо ўсе зоркі пабачыў. А пасля тыдня ўзялі на допыты. Дапытвалі ўкраінцы: адзін трымаў гуму з ланцугом, а другі два цапы. Пасадзілі на крэсла і загадалі рукамі да падлогі нагнуцца. Я налічыў да сарака ўдараў, а пасля ўжо не помню, што са мною было. Не прызнаваўся я, адкуль уцёк, аднак пасля яны высветлілі.

— Каб прызнаўся быў, то не дастаў бы столькі, — сказаў адзін.

Але ці гэта праўда была? Патрымалі мяне там дванаццаць тыдняў і зноў у арбайтсамт у Шчытна адправілі. Новы гаспадар жыў побач польска-нямецкай граніцы; добры быў, можна было ўсім карыстацца, абы толькі навонкі не выносіць. У лютым 1945 года праз маю мясцовасць прайшоў фронт. На суседнім хутары начавалі дзве сям'і з Боцькаў, што вярталіся дадому; я прыстаў да іх і разам з імі прыехаў на радзіму.

Прыехаў, а дома ўжо нікога не было; пад Вадохрышча мая сям'я — бацькі і тры браты — выехала ў Савецкі Саюз. Спачатку жылі яны ў Саратаве, а пасля пераехалі ў Пінск і там усе ўладзіліся на работу. Упершыню наведаў я іх у 1956 годзе. Усе браты, малодшыя за мяне, ужо паўміралі.

А ў нашай хаце ў Малешах жылі кватаранты, якія гаварылі, што хату бацька ім прадаў, але пасля выбраліся. Я лета прабадзяўся, а пад восень пайшоў у Райск да сястры. Адтуль мне высваталі дзяўчыну з Гусакоў і за два тыдні мы паначаліся. Нажылі двое дзяцей: дачку і сына.

Дачку паслалі вучыцца ў ліцэй у Замбраў. Там дырэктарам быў мой школьны сябра Гжэгаж Вашчук з Буйнова, пасля ён сакратарам партыі ў Кольне стаў. Таму і некаторыя бацькі адпраўлялі туды сваіх дзяцей, каб без перашкод дасталіся ў школу. Праз нейкі час дачку перавялі з Замбрава ў Монькі і там яна кончыла ліцэй.

Пасля нашы дзеці — і ўнукі — уладкаваліся ў Бельску. Сын больш чым у Бельску цяпер жыве ў Хаеве, на бацькаўшчыне сваёй жонкі. А доччына дачка вывучылася дантыстам і працуе ў Орлі.

**Запісаў Аляксандр Вярбіцкі**

*Становішча роднай мовы ў многім падобнае на рыбіну, выкінутую на бераг — глытае паветра, падскоквае, але ў такім стане доўга не працягне...*

# www.voka.tk

Больш за стагоддзе прайшло з таго часу як Францішак Багушэвіч заклікаў суайчыннікаў не пакідаць мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі. Часы мінаюць, а заклік і дагэтуль застаецца актуальным. Становішча роднай мовы ў многім падобнае на рыбіну, выкінутую на бераг — глытае паветра, падскоквае, але ў такім стане доўга не працягне. Альбо даскочыць да чыстай рачулкі і пачуе сябе „як рыба ў вадзе", альбо засне назаўсёды. Каб такога не здарылася, тыя, каму словы Багушэвіча кранулі сэрца, робяць часам непрыкметную, але вельмі высакародную справу — падштурхоўваюць, як толькі могуць, моўную сітуацыю ў Беларусі бліжэй да чыстай, празрыстай ракі — беларускасці.

Аб тым, як гэта адбываецца можна даведацца на сайце www.voka.tk.

Набраўшы на сваім камп'ютэры гэты адрас, мы выходзім на вэб-старонку маладзёжнай ініцыятывы „Вока". Пра сэнс яе дзеяння у першых радках: „Сутнасць угледзіш праз гэтыя словы: Любоў да Радзімы, павага да мовы!"

Галоўная старонка сайта надзвычай кідкая. На цалкам аранжавым фоне размешчаны апошнія паведамленні, што тычацца акцый, праведзеных арганізацыяй. Гэта свайго роду стужка навін. Па ўсім відаць, абнаўляецца яна даволі аператыўна і інфармацыя носіць вартасны характар. Так, менавіта адтуль мы можам даведацца, што „Вока" ў цяперашні момант праводзіць так званы „Штурм — FM", сутнасць якога ў тэлефанаваннях на радыёстанцыі і замаўленні беларускамоўных песень. Наколькі гэта ўдаецца — даведайцеся на сайце.

Пад дэвізам уверсе галоўнай старонкі размешчаны выхады да іншых рубрык. Іх нямнога — усяго пяць. Найбольш цікавай падаецца другая — „Наша творчасць". Тут месцяцца некалькі дзесяткаў вершаў маладых людзей. Паэтычныя радкі прысвечаны Беларусі, яе гісторыі, мове, а таксама каханню, дружбе, высокім чалавечым пачуццям. Зразумела, не ўсе яны ёсць шэдэўрамі, але тое, што напісаныя ад шчырага сэрца не выклікае сумненняў.

Рубрыка „Будзем разам" распавядае пра мэты дзейнасці арганізацыі: „Нашыя мэты: данясенне да грамадства беларускай культуры і магчымых напрамкаў яе развіцця ў 21 стагоддзі; гісторыі Беларусі і цікавых звестак пра нашых продкаў; беларускай мовы і растлумачэнне, чаму мы павінны размаўляць па-беларуску".

Ёсць магчымасць далучыцца да арганізатараў і натхняльнікаў руху, пераслаўшы па электроннай пошце свае даныя і кантакты.

У „Гасцёўні" можна даведацца аб уражаннях наведвальнікаў сайта ад убачанага, а таксама прачытаць расповеды прыняўшых удзел у прахозядчай акцыі тэлефанаванняў на радыёстанцыі.

Рубрыка „Форум", як і ўсе падобныя рубрыкі на іншых сайтах, прадастаўляе магчымасць для наведвальнікаў выказацца па тых ці іншых пытаннях дзейнасці арганізацыі. Варта адзначыць, што акцыя „Штурм — FM" не адзінкавая праца „Вока". Літаральна напярэдадні сябры гэтай арганізацыі беларусізоўвалі аператараў мабільнай сувязі, што дзейнічаюць у Беларусі. Ці паспяхова прайшла гэтая беларусізацыя можна даведацца з данай рубрыкі.

Ну і калі зноў вярнуцца на галоўную старонку, то варта звярнуць увагу на яе левы бок. Тут месцяцца банэры самых розных сайтаў з падобнай тэматыкай. А значыць „Вока" не адзінкавая арганізацыя, якая шчыруе на ніве беларускасці.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Найбольш таленавітыя беларускія маладыя трэнеры і гульцы гандбола сканцэнтраваныя зараз у замежжы...*

# Беларусь, беларусы...

**Дома „лістапад", „цвет" за мяжой**

Няўдалым выдаўся сезон на міжнароднай арэне для беларускіх гандбольных клубаў. Амаль усе яны выбылі ў першым жа раундзе розыгрышаў. Такія вынікі не здзіўляюць, бо ўвесь „цвет" айчыннага гандбола выступае зараз на замежных пляцоўках.

Упершыню ў сваёй гісторыі ўдзел у гандбольнай Лізе чэмпіёнаў узяў брэсцкі клуб імя Мяшкова. Здарылася гэта так. Прайшоўшы адзін адборавы этап, беларусы трапілі ў далейшую кваліфікацыю з-за адмовы ўдзелу ў спаборы партугальскай каманды. Далейшыя супернікі — расійская „Чэхаўскія мядзведзі" (нашчадкі былога маскоўскага ЦСКА), дацкі „Гудме" і славенскі „Гарэньне" сталі беларусам не па зубах. Хоць нашы змагаліся самааддана і аднойчы перамаглі, але занялі ў групе апошняе чацвёртае месца. Тым не менш шэраг нашых майстроў ручнога мяча працягнуць выступаць у самым прэстыжным турніры — Іван Броўка і Сяргей Гарбок у складзе ўкраінскага ЗТР (Запарожжа), Андрэй Клімавец — нямецкага „Фленсбурга" (лідэра бундэслігі), Сяргей Рутэнка — славенскага „Цэле". Пасля таго, як скончыў выступаць Міхаіл Якімовіч, Рутэнка — самы яркі беларускі гандбольны легіянер. У мінулым розыгрышы ён стаў лепшым бамбардырам Лігі чэмпіёнаў, цяпер зноў, закінуўшы 52 мячы, захапіў лідэрства ў гэтай намінацыі.

Найбольш таленавітыя беларускія маладыя трэнеры і гульцы сканцэнтраваныя зараз у замежжы. Былыя зоркі славутага мінскага СКА, скончыўшы кар'еру, спрабуюць настаўніцкі хлеб там, дзе за гэта добра плацяць. Найлепшых вынікаў дасягнуў пакуль колішні крайні дружынаў СССР і Беларусі Юры Шаўцоў з нямецкімі клубамі — цяпер ён галоўны ў нямецкім ТУСЕМе з горада Эсэн. У другой бундэслізе працуе былы распасоўшчык зборнай Георгі Свірыдэнка. А Аляксандр Маліноўскі вывеў у лідэры польскай лігі каманду „Віво".

Найбольш нашых гульцоў у гандбольнаразвітай Нямеччыне. У мацнейшым дывізіёне, акрамя згаданага Клімаўца, выступаюць такія вядомыя майстры як гігант Генадзь Халепа (у гэтай краіне ён ужо 12 год, цяпер у „Вецлары"), Андрэй Сіняк („Гамбург") Андрэй Курчаў („Пфулінген"), у другой бундэслізе Уладзімір Гольдзін, галкіпер Віталь Фешчанка. Поўна ў нямецкіх камандах і беларускіх гандбалістак — там гуляюць такія „зоркі" як Тацяна Хліманкова, Святлана Мінеўская, Ала Галынская, Ірына Калпакова, Раіса Ціхановіч. Усе яны на першых ролях. У Даніі выступае Тацяна Сіліч, у Польшчы — Крысціна Сватко, у Славеніі, акрамя Рутэнкі, Сяргей Убажэнка, у Швейцарыі — Аляксей Усік. Некаторыя нашы працуюць цэлымі сем'ямі. Так, ураджэнцы Гродна, браты Аляксандр і Андрэй Мінеўскія даўно атабарыліся ў Нямеччыне, жонка Андрэя, Святлана (двухразовая чэмпіёнка свету), працягвае выступаць.

Прымаючы іншае грамадзянства, легіянеры губляюць сувязі з радзімай, тым больш, што беларускае заканадаўства не дазваляе мець падвойнае грамадзянства. На Беларусь рэдка хто вяртаецца. Такія прыклады рэдкія — нядаўна пасля сямі гадоў легіянерства ў Нямеччыне, Швейцарыі і Аўстрыі вярнуўся Міхаіл Усачоў. Новым прыстанкам ён абраў брэсцкі клуб.

У сённяшняй Беларусі гандболу не надаецца прыярытэтаў, праца трэнераў і гульцоў аплачваецца мізэрна. Так што „лістапад" будзе доўжыцца.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Нязнойдзенае і так знойдзем*

*Як каму ці чаму на шчасце — гэтак і будзе, кажуць у народзе. Шчасце маюць і людзі, і звяры, і рэчы. Як каму шанцуе. Калі што прападзе, дык пішы прапала, але, здараецца, што часта ўсё вяртаецца ў свае каляіны.*

*Аднойчы Анатоль Парэмбскі, тады жыхар Мастаўлян, ідучы дарогай з Кітурык бадай у Зубры ці то ў Раманава, знайшоў на абочыне дарогі новы ровар. Выцягнуў яго з рова, направіў зляцеўшы ланцуг, і паехаў на ім далей. Дзе ні быў — і на Сакольшчыне, і на Беласточчыне, стаў распытваць пра той веласіпед. Ці хто яго не згубіў, ці хто не меў дарожнай аварыі. Праўда, на нейкую вялікую катастрофу не паказвала, ровар быў цэлы, непаабіваны з фарбы. Мабыць, хтосьці яго проста згубіў. Але хто так сабе кідае ровар у адкосе? Аднойчы, з год пасля таго здарэння, трапіў Анатоль на вяселле ў Бандары. Там і стаў за сталом расказваць пра сваю знаходку свайму суседу на застоллі. А гэта якраз і быў той дзядзька, здаецца, з Ціванюкоў, якому прапаў той ровар. Моманту прапажы не вельмі памятаў: ехаў быў з гасціны пацёмку, перакуліўся ў роў, паляжаў крыху, устаў ды пайшоў дахаты. Пра тое, што на ровары выбраўся быў у Зубры, не памятаў. Меркаваў пасля, што забыўся яго на расчыненым падворку ў Зубрах, там, пэўна, хтосьці яго забраў. Пытаўся пасля ў знаёмых, але на Анатоля трапіў аж праз год. Так і вярнулася амаль новая „Украіна" да гаспадара, крышку з'езджаная, але тая ж, бо памечаная пад сядзёлкам спецыяльным гаспадаровым знакам. Рэгістрацыйнай табліцы ж цяпер веласіпеды не маюць...*

*Не маюць такога віднага знаку і фотаапараты. Страціла і я таго свайго памочніка — срэбны, незадарагі, але і някепскі, карэйскі фотаапарат на японскай ліцэнзіі. І махнула рукою! Дзе ж ён мне прапаў! Па дарозе ў Гарадок, на сустрэчу з Нінай Цыванюк я ехала, каб напісаць пра гісторыю гурту „Расспяваны Гарадок". Села ў мікробус прыватнай фірмы, што танна возіць у Гарадок праз Міхалова; ёсць і большыя аўтобусы, а гэты быў малы і цесны. Надта ж ціснулася да мяне мажная жанчына ў зялёнай куртцы, заглядала ў сумку, пукатую ад „Ніваў". І раптам выскачыла ў Міхалове, як апошняя з пасажыраў, неспадзявана. З маім фотаапаратам, запакаваным у футляр, падобны да пукатага кашалька.*

*Недахоп фотаапарата заўважыла я, калі хацеў ён зняць вынікі працы баброў у Гарадку. Вось, пасярод мястэчка, пад мостам на Супраслі, пасяліліся бабры, валяць дрэвы, і жывуць як у сябе. Значыць, атмасфера добрая тут, каб жыць. Нейкі дзядзька якраз шукаў Гарадка, тавар вёз, ды не ў той Гарадок трапіў, а ён асацыяваўся яму з Грудкам з фільма „M. jak miłość", найбольш папулярным у Польшчы тэлесерыялам...*

*Фотаапарата няма. І не будзе. Хто ж знойдзе такую прапажу! Паколькі я без фотаапарата як без рук, адразу пайшла і набыла іншы, на расплату ў шэсць месяцаў.*

*Праз два месяцы тэлефон ад Міркі Антановіч з Гарадка: фотаапарат знайшоўся! Пакінуты на аўтобусным прыпынку ў Міхалове (усё ж — не грошы там былі, і хцівая дама кінула яго на прыпынкавай лаўцы), трапіў ён у рукі шафёра ПКС, спадара Гарэнюка, родам з Гарадка. Праз нейкі час праявіў ён фотаплёнку, і прынёс да свайго бацькі, Міколы Гарэнюка, на кансультацыю. А той і распазнаў на здымках Мірку Антановіч, гаспадыньку з Гарадка, моцную беларускую жанчыну, з якой я тыдзень раней да прапажы вяла размову.*

*— Чые гэта, Мірка, ногі? — спытаўся з ухмылкай дзядзька Мікола Гарэнюк, паказваючы на пробны, першы здымак, дзе мой малы сын Радаслаў зняў свае маленькія ступачкі разам з вялікімі ступнямі свае каханай бабулі Зіны. І Мірка заплаціла Гарэнюку за файныя праяўленыя здымкі свае і свае вучонай ды прыгожай (зважайце, нашы хлопцы!) дачкі Дароты, што працуе ў Валілах у фірме Мартынюка, ды „экстра" за цудоўна знойдзены фотаапарат.*

*Пазваніла Мірка Антановіч спачатку маёй цёці Ніне ў Меляшкі, каб разведаць мой адрас. А адвячоркам пазваніла мне, што знайшоўся ён...*

*Думаю, што пра такія незвычайныя сустрэчы можа расказаць не адзін з нашых чытачоў...*

**Міра Лукша**

Да юбілею Гайнаўскага беларускага ліцэя

# Мае ўдачы і няўдачы



### Іегавіст

*Закончыўшы ж школу, ужо ў дарослым жыцці, нярэдка бывае так, што тыя на каго школа лічыла, каго „фаварызавала”, раствараюцца, губляюцца на жыцейскіх сцежках-дарожках, не знаходзячы свайго месца ў жыцці. А бывае нават і так, што спатыкаюцца яны на некаторых параграфах крымінальнага кодэкса.*

*А вось многія з тых, якія ў школе не грашылі ні працавітасцю, ні дысцыплінай і на якіх школа не надта разлічвала, радзяць сабе ў дарослым жыцці зусім добра і вельмі добра. Становяцца яны знанымі і шанаванымі людзьмі. І выдатнымі беларусамі, у нашым выпадку. Так што не варта заўчасна спісваць людзей на страты.*

*А разумнай дзяржаўнай палітыкі тут не было. Раз з-за міністэрскіх і куратарскіх трыбун грымелі, каб звяртаць галоўную ўвагу на слабейшых вучняў, бо добрыя і самі сабе парадзяць. Другі раз — на сярэдніх. Трэці раз быў прыказ — найбольшую ўвагу ўдзяляць найлепшым...*

*Школа — гэта вельмі жывы, імпульсіўны арганізм. І ім, як у калейдаскопе, хутка перапляталюцца з сабой розныя здарэнні, настроі, сітуацыі, напрыклад, вясёлае з сумным, аптымістычнае з песімістычным, сур'ёзнае са смешным. І настаўнік павінен умець знайсціся ў кожнай такой сітуацыі.*

*Каб увесці чытача ў школьную атмасферу, прывяду некалькі прыкладаў маіх уласных удач-няўдач у ліцэі.*

*Гайнаўскаму беларускаму ліцэю аддаў я трыццаць пяць сваіх працоўных гадоў (1963-1998). Нялёгкія гэта былі гады і для мяне, і для ліцэя, але напэўна цікавыя. Праца ў школе, тым больш у сярэдняй школе, заўсёды цікавая. Трыццаць з гэтых гадоў працаваў у яшчэ старэнькім школьным будынку, можна сказаць, бараку. Ён быў і цесны, і халодны, і патрабаваў сталага рамонту. Пяць апошніх гадоў — ужо ў новым, вялікім і прыгожым будынку.*

*У нашым ліцэі вучылася як гарадская моладзь, так і моладзь з акалічных пушчанскіх і прыпушчанскіх вёсак. Адным словам, глыбокая правінцыя.*

*Абсалютную большасць вучнёўскай моладзі нашага ліцэя заўсёды складалі вучні-беларусы, праваслаўныя. Але нямала заўсёды вучылася ў нас таксама польскай каталіцкай моладзі, баптысцкай, іегавістаў і бадай усіх іншых веравызнанняў існуючых у нашай мясцовасці. І гэта не перашкаджала ў навучальна-выхаваўчым працэсе.*

*Помніцца мне толькі адзін даволі нетыповы выпадак. У адным маім класе быў моцна веруючы вучань-іегавіст. А былі гэта яшчэ моцна атэістычныя часы. І гэтай атэістычнасці проста адміністрацыйна патрабавалі ад кожнага настаўніка і вучня. Быў ён добрым, а нават вельмі добрым вучнем, але толькі з тых прадметаў, якія — на яго думку — не парушалі законаў яго веры. Не браў ён удзелу ні ў розных імпрэзах, ні танцавальных вечарынах, ні абавязковых першамайскіх і іншых святкаваннях, шэсцях і дэманстрацыях. Не залічаў праграмна абавязковых тады норм па стральбе, бо грэх браць ружжо ў рукі і г.д.*

*Я яго пераконваў, прасіў, страшыў карамі за непадпарадкаванне школьным правілам, але не памагала. Тады паклікаў я яго бацькоў. Прыйшла маці — і я панаракаў ёй на паводзіны сына, спадзяючыся на яе падтрымку і дапамогу. Яна „смиренно” мяне выслухала ды станоўча заявіла:*

*— Я не толькі згаджаюся з сынам, але і ганаруся яго цвёрдай верай.*

*— То што з ім будзе далей? — наіўна пытаюся. — Перад ім жа абавязковая служба ў арміі і ўсё жыццё?..*

*— У войска ён не пойдзе, — спакойна і ўпэўнена адказала яна. — Ён адсядзіць за гэта ў турме, мы ўжо даўно рашылі гэта...*

*Я зразумеў, што далейшае маё перавыхоўванне маладога іегавіста не мае сэнсу. Трэба прымкнуць вочы на яго палітычную нядобранадзейнасць і абавязкова давесці яго да заканчэння школы і атэстата сталасці такім, якім ён ёсць. І нічога не станецца нашай народнай уладзе, калі адзін з маіх вучняў будзе жыць і не па марксісцка-ленінскіх, а па Хрыстовых запаветах. Ёсць чаму грашыць у нас, няхай будзе каму і адмольваць грахі нашы. І далей — ён пасяхова закончыў ліцэй і атрымаў атэстат сталасці...*

*І ўжо як выпускнік прыйшоў аднойчы да мяне дадому.*

*— У чым справа? — пытаюся.*

*— Прыйшоў з вамі развітацца, — кажа, — і ўручае мне падарунак: прыгожае выданне „Біблії” на рускай мове і савецкі каньяк.*

*— А не грэх трымаць і дарыць „Біблію” ў капманіі з каньяком ды яшчэ савецкім? — пытаю.*

*— Можна, — адказвае.*

*— За „Біблію” шчыра дзякую, я заўсёды хацеў мець такую. А каньяк прыму толькі тады, калі на развітанне вып'ем зараз па чарцы майго хатняга каньяку.*

*Ён згаджаецца, я дастаю з буфета і разліваю ў кілішкі самагонку, мы чокаемся кілішкамі, выпіваем і развітваемся.*

*— Жадаю табе шчасця, сынок!*

*І сумна падумаў: да замагільнага жыцця ты рыхтуешся грунтоўна і напэўна заслужыш яго, але дамагільнае напэўна будзе нялёгкім у цябе. І мне стала шкада яго.*

**Васіль Сакоўскі**

На што разлічваць у новых умовах?

# Гаспадарыць ці аблясаць?

Такое пытанне ставяць сабе многія сяляне Гайнаўскага павета, якія гаспадараць на землях пятага або шостага класаў. Спакушаюць даплаты да аблесеных участкаў, якія прапанаваліся ўрадам і будуць выплачвацца з еўрасаюзнага бюджэту.

У Павятовым бюро Агенцтва мадэрнізацыі і пераўтварэнняў сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы прадбачваюць, што ў бліжэйшы час каля 300 асоб з Гайнаўшчыны пададуць заяўкі на дазвол на аблясенне палёў з атрыманнем даплатаў з еўрасаюзнага бюджэту. Такая колькасць асоб раней атрымала з Гайнаўскага старосты адмоўныя адказы на прашэнні аб аблясенні з даплатамі.

— Аднак не выдаем дазволаў на аблясенне, бо ў нашых гмінах няма планаў прасторавага добраўпарадкавання. Чакаем змены пастановы Рады Міністраў, якая дазволіць аблясаць без згаданых планаў, — інфармуе кіраўнік павятовага бюро ў Гайнаўцы Мікола Яноўскі.

Прадбачваецца, што гаспадары, якія аблесяць свае палі, атрымаюць каля 5 тысяч злотых на саджанцы (на 1 гектар). Калі будуць выконваць пры саджанцах усе неабходныя лясныя работы, павінны 5 гадоў атрымліваць па 420 злотых даплаты да кожнага гектара. У выпадку небяспекі знішчэння лесу звярынай (калі пацвердзіць гэта надлясніцтва), могуць атрымаць 2 400 злотых на агароджу гектара лесу. Аднак, на практыцы, можа быць цяжка рэалізаваць многія ўказанні надлясніцтва, неабходныя для аховы саджанцаў. Тыя гаспадары, якія раней рашыліся аблясаць палі, ужо цяпер наракаюць, што цяжка выканаць патрабаванні ляснічых (ад іх залежыць грашовая кампенсацыя). Больш прывабная для аматараў аблясяння можа стаць прэмія за само аблясенне, размерам 1 400 злотых у год (да гектара), якая павінна выплачвацца на працягу 20 гадоў. Каб атрымаць такую даплату, трэба па-сур'ёзнаму займацца сельскай гаспадаркай. Калі гаспадар атрымлівае менш чым 20% даходу з сельскай гаспадаркі (апошнія сродкі здабывае на іншай рабоце), то можа разлічваць толькі на 360 злотых прэміі ў год.

У Гайнаўскім павеце каля 10 тысяч гектараў зямлі, прызначанай для сельскагаспадарчага выкарыстання, ляжыць аблагом і таму можа павелічацца лік аматараў іх аблясення. Аднак гаспадары павінны задумацца, ці не захочуць вярнуцца да гаспадарання іх дзеці або ўнукі. Запатрабаванне на зямлю, якая можа быць выкарыстана для сельскагаспадарчай прадукцыі, павінна ўзрастаць.

Сектарная аперацыйная праграма „Мадэрнізацыя і пераўтварэнне харчовага сектара і развіццё вясковых тэрыторый” прадбачвае дапамогу гаспадарам, якія рашацца разгарнуць дзейнасць. Маладым землягробам, якія пераналі зямлю, плацяць складчыну ў КРУС і гаспадараць карацей чым год часу (або гаспадараць даўжэй, але ў гэтым часе вучыліся ў вышэйшых навучальных установах), прадбачваецца выплачванне прэміі ў памеры 50 тысяч злотых. Грошы можна будзе выкарыстаць на куплю машын, зямлі ці на будаўнічыя інвестыцыі. Вытворцы з малатаварных гаспадарак могуць атрымліваць на працягу 3 гадоў па 5 тысяч злотых у год. Калі сяляне будуць выдаткоўваць сродкі згодна з загадзя падрыхтаваным планам, можна будзе прадоўжыць ім дапамогу на чарговы тэрмін. Гаспадары, якія ўжо разгарнулі дзейнасць, могуць выступаць за дапамогай размерам да 60% вартасці інвестыцыі (асобы ва ўзросце да 40 гадоў — да 65% інвестыцыі). Аднак фінансавая ўспамога не можа быць вышэйшай за 300 тысяч злотых. Хадайніцтва аб сродкі павінна быць падмацавана бізнеспланам, саставіць які дапамагаюць сельскагаспадарчыя дарадчыя асяродкі.

Аднак, у мінулым, вельмі цяжка было атрымаць дапамогу з фонду „Сапард” і таму гаспадары з недаверам глядзяць на новыя прапановы.

— Мы падалі прашэнне на дафінансаванне разбудовы аборы. Не маглі атрымаць успамогі з „Сапарду”, бо не гадавалі кароў у адпаведнасці з еўрасаюзнымі патрабаваннямі. Прыйшлося перабудоўваць хлеў за свае грошы і ўзяць крэдыт. Не чулі, таксама, каб нехта ў нашай вёсцы або наваколлі атрымаў дапамогу з „Сапарду”. Аднак цяпер хочам выступаць за дафінансаванне куплі сельскагаспадарчых машын, — кажа Анна Трашчотка са Старога Беразова. На перабудову хлява спадарства Трашчоткі ўзялі крэдыт пад 1,4% (для маладых гаспадароў), растэрмінаваны на многія гады. У выпадку 50% фінансавання інвестыцыі з „Сапарду” трэба было б вылажыць уласныя сродкі (спачатку 100% інвестыцыі) або карыстацца камерцыйным крэдытам, які зараз не пад сілу для многіх гаспадароў. Можа новыя ўмовы дафінансавання сельскагаспадарчай дзейнасці больш спрыяльныя для гаспадароў і будзе больш ахвотных пакарыстацца дапамогай.

Некаторыя палі, якія зараз ляжаць аблагом, цяжка ўжо вярнуць для сельскагаспадарчага выкарыстання і таму пакідаю самім чытачам адказаць на індывідуальныя пытанні — гаспадарыць ці аблясаць? У глабальным, лепш не спяшацца з пераўтварэннем сельскагаспадарчых палёў у лясныя масівы. Калі б за некалькі гадоў еўрасаюзныя або дзяржаўныя ўлады рашыліся спыніць лясныя даплаты, немагчымым будзе вярнуць поле для звычайнага, сельскагаспадарчага выкарыстання.

(заканчэнне будзе)

**Аляксей Мароз**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 981 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2005 r. upływa 5 grudnia 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

## „Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

Над старым хворым стаяць ягоная жонка з лекарам.

— Як доўга, пан доктар, ён будзе так цярпець? — усхліпвае жонка.

У гэты момант старэча разжмурвае вочы, прыглядаецца жонцы і заходзіцца енкам:

— Выйдзі адсюль ты ведзьма, ты гадзюка!

— Ой, пан доктар, — усклікае яна ўсхвалявана, — хіба яму лепш — ён мяне пазнаў!

* * *

Дарогаю едзе рыцар на кані. Раптам бачыць ён натоўп людзей, які валіць проста на яго. Рыцар захіліўся за куст, а натоўп пабег далей. Рыцар выйшаў з-за куста і ўбачыў наступную бягучую гурму. Цяпер ён не саступаў, але ўхапіў аднаго ватажніка і пытае:

— Мабыць у наваколлі паявіўся змей і ўсе ад яго ўцякаеце?

— Не-е! За вуглом адкрылі новы супермаркет.

* * *

— У тваёй шуфлядзе, — кажа муж жонцы, — я знайшоў ліст з матрыманіяльнага бюро, у якім паведамляецца, што прышлюць прапанову на твой запыт. Што гэта абазначае?!

— Ой, даражэнькі, не гневайся на мяне, гэта ўжо няпраўда.

— Як?!

— Гэта было тады, калі ты быў цяжка захварэў.

* * *

У набітым пасажырамі трамваі сядзіць экзатычны чужынец. На прыпынку ўваходзіць пажылая жанчына і стае каля яго. Нейкі час нецярпліва пераступае з нагі на нагу і неўзабаве азываецца:

— У нашай краіне пажылым жанчынам, такім як я, саступаюць сядзячыя месцы.

Чужаземец агляднуўся і буркнуў:

— А ў нашай краіне такіх старых баб папросту з'ядаюць.

* * *

— Чаму абразы абведзены рамамі?

— Каб мастак ведаў, калі завяршыць працу.

* * *

На выстаўцы мастацтва рэцэнзент шэпча жонцы:

— Паглядзі на гэты абраз: ягоная рама гэта сапраўдны шэдэўр мастацтва!

### Бацікі з горада Шагала

*Часопіс „Беларускі акцэнт”, часопіс грамадскай гімназіі № 32 „Настроі+” і Дом культуры „Сьрудмесце” ў Варшаве арганізавалі выставу бацікаў Алены Дзікавіцкай — выпускніцы аддзялення мастацтва і графікі Дзяржаўнага універсітэта ў Віцебску. Выстава працуе ў днях 24-29 лістапада 2004 г. у Доме культуры „Сьрудмесьце”, вул. Смольна 9 (уваход ад Еразалімскіх алеяў).*


КВАТЭРА

**Наша журналістка (муж і дачка) шукае тэрміновa зняць невялікую кватэру ў Беластоку. Мабільнік (0) 691 698 511 або звaніце ў рэдакцыю 743 50 22 у гадзінах 9⁰⁰ — 15⁰⁰.**




Басовішча 2004

Фота БАГУСЛАВА СКОКА

## Музычныя навіны

Інфармацый пра беларускі рок у сеціве Інтэрнэт усё больш. Чарговыя гурты, якія моцна фіксуюцца на рок-сцэне, адкрываюць свае сайты. Варта іх наведваць па некалькіх прычынах. Па-першае, можна знайсці там самыя новыя запісы ў фармаце мп3, па-другое, на сайтах змяшчаюцца навіны ды фатаграфіі куміраў. Зараз большасць вядомых зорак ад некалькіх гадоў маюць свае сайты. Маладыя рокеры не застаюцца ззаду. Зусім нядаўна свае старонкі адкрылі гурт „Індыга” — www.indiga.net ды гурт „Сьцяна” — stiana.pesni.ru.

Адзін з самых вядомых, ды самых любімых гуртоў у Беларусі выпускае ў продаж два альбомы за адзін раз. Гаворка пра мінскую рокблюзавую „Краму”. Ігар Варашкевіч ужо здаўна інфармаваў пра канцэртную кружэлку. Ужо ведаем, што канцэрт, які адбыўся ў Наваполацку, з'явіцца ў продажы 5 снежня. Разам з ім „Крама” вырашыла ажыццявіць праект англамоўнага альбома „Гарэлка на лёдзе”. Прадуцэнтам альбомаў з'яўляецца BMA group.

Татка Стэп

## Адгаданка



1. пустата ў ствале дрэва або зуба, 2. дарога праз горад або вёску, 3. постаць тулава, 4. Мікалай, расійскі жывапісец (1831-1994), 5. імя Караткeвіча, 6. дзяржава з Венай, 7. Канстанцін, адзін са стваральнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі, генерал (1893-1946), 8. не цячэ пад ляжачы камень. (ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 42 нумара**

Клубок, рука, клас, яўрэй, цырк, дывізія, рэванш.

Рашэнне: **Бура ў шклянцы вады.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

## 28.11 – 4.12

**Баран (21.03. — 19.04.)** Варта задбаць пра тое, каб жарсці разгарэліся з новай сілай. Цяжкія выбары і неабходнасць важных рашэнняў. Давярай інтуіцыі, калі думаеш пра пачуцці. На працы не дазволь вывесці сябе з раўнавагі.

**Бык (20.04. — 20.05.)** З перашкодамі справішся хутка. Час міне як стрэліўшы з біча. Паправяцца твае адносіны з атачэннем. Гармонія нават там, дзе пары між сабою „дзяруць каты”. Добрае здароўе, але старайся не абжырацца ласункамі.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Пааплачваеш амаль усе недаборы. Шмат спраў вытлумачыцца, але не спадзявайся, што ўздыхнеш з палёгкай — з некаторых вырашэнняў задаволены не будзеш. Магчымы непаразуменні і астыванне пачуццяў. Можаш сустрэць уплывовую асобу, якая паможа рэалізаваць твае намеры.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Пагоршацца мілыя адносіны на працы. Можаш купіць барахло альбо быць залішне шчодрым. Знакаміта дамовішся з жанчынамі, знаёмства з імі можа быць інспірацыяй. Запісвай сны, хоць здадуцца часам банальнымі ці незразумелымі — яны шмат скажуць аб табе.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Трываласць і вітальнасць. Канцэнтруйся на тым, што сёння, не выбягай думкай задалёка ў будучыню і не раздумвай над былым. Свядома думай аб сучасным. Твая неканвенцыянальная і адначасова актыўная пазіцыя прынясе пахвалы і прызнанне.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Знакаміта пойдуць перамовы ў далікатных справах. Калі лечыш раны пасля балючых перажыванняў, не ўваходзь у раманы і новыя сувязі, бо замнога ў табе болю і злосці. Самотная Дзева пазнаёміцца з кімсьці вельмі цікавым. Шмат уражанняў у сямейным жыцці. „Ніхто не можа быць разумным з пустым страўнікам”.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** У любоўных змаганнях страта можа аказацца прыбыткам, а мімалётны флірт — выбарам на ўсё жыццё. У кар'еры можаш разлічваць на падтрымку свайго жыццёвага партнёра. Старайся, каб кожны твой дзень быў як мастацкі твор.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Можаш зачараваць каго захочаш! Моцны тэмп жыцця. Для свабодных Скарпіёнаў ідэальны тыдзень знайсці адпаведнага партнёра. Магчымыя скокі ціску ды гарачка.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Вельмі добры кантакт з сябрамі. Шчаслівa закаханыя будуць перажываць эйфарыю. Могуць наведаць цябе старыя сябры з-за мяжы. Апранайся цяплей.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Казярогі закаханыя без узаемнасці непатрэбна трацяць час. Азірніся навокал — ці не бачыш таго, хто табою цікавіцца здаўна? Палагоджанне канфлікту ў сям'і. Падымі свае кваліфікацыі.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Пачуццёвыя разлады закончацца гарачым паяднаннем. Апынешся ў асяроддзі раней табе невядомым. Трымаеш у руках павадкі ад свае кар'еры.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Узмоцніцца твая прафесійная пазіцыя. Акажацца, што ты сапраўды незаменны. Усвядоміш сабе важнасць шчырасці і сумленнасці, што такое спеласць і як ёю кіравацца.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960